ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарновым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адатку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 18-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

АЎТОРАК 3 чэрвеня 1930 г.
№ 128 (3726)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

XIII зьезд КП(б)Б

ЗЬЕЗД УХВАЛІЎ ЛІНІЮ І ЎСЮ РАБОТУ ЦКК УсеКП(б)

Спрэчкі па дакладу т. Мануільскага аб рабоце ЦК УсеКП(б)

Прамова М. М. Галадзеда

таварышы! Наш ленінскі Цэнтральны ітэт Усесаюзнай Камуністычнай тыі, а пад яго бальшавіцкім кіраўтвам і ўся партыя, надыходзіць да і зьезду з вялізарным станоўчым басам як у пытаньнях міжнароднае ітыкі, так і ў пытаньнях сацыялічнага будаўніцтва ў краіне саветаў раіне пралетарскай дыктатуры, а сама і у барацьбе за ленінскае адзін, за ленінскае выхаваньне нашай тыі, за яе генэральную лінію, за інскую лінію ўсяго камуністычнага рнацыяналу ў барацьбе з усякімі шчэньнямі ад гэтай ленінскай лініі. міжнародных пытаньнях палітыка у, якую пасьлядоўна праводзіць наш УсеКП(б), дала магчымасьць нашай тыі і ўсёй рабочай клясе нашай краі выкарыстаць перадышку для ацненьня пазыцый сацыялізму. Пад прабаваным кіраўніцтвам ЦК КП(б), урад Савецкага Саюзу ўмела йшоў за гэты пэрыяд праз усе праацы імпэрыялістычных дзяржаў, правакавалі нас на вайну. Палітыміру, якую ўмела праводзіць наш не даючы асобным зарваўшымся-каалістычным дзяржавам наступіць , як кажуць, «на мазоль», мабілічы сотні мільёнаў рабочае клясы го сьвету і ўсіх прыгнечаных народаў, ўным чынам калёніяльных краін і ін уходу, мабілізуючы на абарону сцкага Саюзу ад імпэрыялістычнага аду.

ыя вялізарныя дасягненьні, якія мае а партыя і ўвесь Камуністычны Інацыянал ва ўздыме і пашырэньні нюцыйнага руху рабочай клясы ва сьвеце і ў яе кансалідацыі, пацьжаюць правільнасьць прагнозу і ізу нашай партыі, які даны нашай ыяй у выглядзе канстатаваньня лідоўнага, няўхільнага расхістаньтак званай, адносная капіталістычстабілізацыі. Гэта нацьвяржае насьць і рост імпэрыялістычных прэчнасьцяй і рост сацыяльна-кляых супярэчнасьцяй. Гэта перакульцалкам і без астатку тэорыі правых тунстых аб так званым «арганізаі капіталізьме».

наймагутнейшыя гіганты, сёньня яны ўжо на фоне росту нашага электрабудаўніцтва не зьяўляюцца станцыямі характэрнымі для раённага маштабу і становяцца часамі станцыямі, якія маюць мясцовае значэньне. Так, электрастанцыі ў 30-50 тыс. кілёв. сёньня ўжо, дзякуючы вялізарнаму тэмпу разьвіцьця нашай індустрыялізацыі, ужо ня могуць поўнасьцю здавальняць патрэб раённага значэньня. Сёньня мінімальная ёмістасьць раённых электрастанцый перад намі вырысоўваецца (і па справе будуюцца) сілаю ня менш, як 100 тыс. квт.

У Беларусі мы таксама пераходзім ужо на шлях будаўніцтва буйных камбінатаў, мы ў кантрольных пунктах на 1930-31 г. запраектавалі будаўніцтва буйнога камбінату на прапойскіх тарфяных масавых. Прапойскі камбінат павінен уключаць на нашых меркаваньнях электрастанцыю ў 100 тыс. квт. буйны завод на выпрацоўцы мінэральных угнаеньняў і другія прадпрыемствы, якія будуць базавацца на торфе, як на сырцовай базе.

З тых лічбаў і фактаў, якія аталошаны т. Мануільскім, таксама відаць, што на фоне гэтага магутнага індустрыяльнага росту ў нас ёсьць і слабыя месцы. Аб іх мы павінны гаварыць, і было-б зусім няправільна, калі-б іх прыкрывалі, калі-б мы не гаварылі, дзе трэба падцягнуць нашу работу і дзе мы сустракаемся з труднасьцямі. З гэтых слабых месц я хачу спыніцца толькі на некаторых, паколькі т. Мануільскі ўжо падрабязна гэтае пытаньне высьвятляў. Я хачу закрануць такія галіны—мэталь, экспарт і машынабудаўніцтва,—якія яшчэ зьяўляюцца слабымі месцамі, якія партыя павінна падцягнуць з самай напружанай энэргіяй.

Пытаньням мэталю, машынабудаўніцтва і экспарту Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) надае цэнтральнае месца, але гэтыя пытаньні павінны і ў далейшым яшчэ больш сканцэнтраваць увагу ўсёй нашай партыі. Пры нашых надзвычай вялікіх тэмпах, якімі мы ідзем на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, мэталь і выраб машын будуць на сутнасьці рашаючымі фактарамі далейшых тэмпаў сацыялістычнага разьвіцьця нашае краіны.

Тав. Сталін ня раз гаварыў аб тым, што наша першачарговая задача заключаецца ў тым, каб пасьлядоўна і як мага хутчэй, пры разьвіцьні сваёй уласнай («отечественной») буйной машыннай індустрыі вызваляцца ад эканамічнай залежнасьці капіталістычных дзяржаў.

Таварышы! Вырашэньне гэтай важнейшай задачы ў першую чаргу і галоўным чынам павінна ісьці і залежыць ад фарсаванага разьвіцьця прамысловасьці, якая вырабляе сродкі вытворчасьці, г. зн. буйной машыннай індустрыі, і вырашэньня праблемы мэталюргічнай прамысловасьці. Разьвіцьцё ўласнай машыннай індустрыі зьяўляецца ключом да вырашэньня гэтай задачы эканамічнага вызваленьня ад залежнасьці ад капіталістычных дзяржаў, пакуль у іх не адбылася пралетарская рэвалюцыя.

Таму мы можам сёньня, на XIII зьезьдзе КП(б)Б, адзначыць, што Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Камуністычнай партыі вядзе зусім правільную лінію, калі ён асноўную масу сродкаў накіроўвае на разьвіцьцё буйной прамысловасьці, вядучай індустрыі і калі ён значную частку прыбыткаў лёгкай прамысловасьці перакідвае ў разьвіцьцё буйнай прамысловасьці. Гэта палітыка правільная, яе трэба працягваць і надалей. Вядучыя галіны нашай індустрыялізацыі павінны ў першую чаргу мець ад дзяржавы матар'яльнае, фінансавае і энэргетычнае падтрыманьне. Ня будзе перавялічаным, калі скажу, што мэталь і ўласнае («отечественное») машынабудаўніцтва ў далейшым будуць асноўным лімітам тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Экспартная справа зьяўляецца таксама ў цэнтры работы нашай партыі.

Тав. Мануільскі ўжо сказаў адносна становішча экспартна-імпартнага пляну, і я наконт гэтага паўтарацца ня буду. Я толькі адзначу, што і перад КП(б)Б таксама ў галіне экспарту стаіць адказьнейшая задача. БССР—такая рэспубліка, якая можа даць добры прыклад разьвіцьця экспарту другарадных галін. Сёньня, пасьля выпадзеньня ў апошнія гады з экспартнага пляну хлеба, другарадныя галіны экспарту ўжо перастаюць быць другараднымі. Яны ўсё больш і больш адыгрываюць сур'ёзную ролю ва ўзмацненьні нашага валютнага пляну. Таму задача ўсёй нашай партыі, усёй КП(б)Б і савецкай грамадзкасьці Беларусі ў галіне разьвіцьця экспарту заключаецца ў тым, каб мы заданьне ЦК УсеКП(б), заданьне ўраду Саюзу выканалі на ўсе 100 проц. Пытаньні валюты і экспарту, а гэтым самым пытаньні імпартнага абсталяваньня зьяўляюцца такімі пытаньнямі, якія стаяць у галаве вугла эканамічнай палітыкі нашай партыі.

У нас, таварышы, ёсьць цэлы рад праблем у галіне прамысловага будаўніцтва БССР. Я хачу зараз паставіць гэтыя праблемы, якія стаяць перад КП(б)Б, у сувязі з дакладам т. Мануільскага аб рабоце ЦК УсеКП(б) і з тэй мэтай, каб высунуць гэтыя пытаньні, каб мець яшчэ больш падтрыманьне з боку ЦК УсеКП(б) у справе індустрыялізацыі Савецкай Беларусі, як часткі Савецкага Саюзу.

Асноўная праблемай у нас у БССР зьяўляецца торф. Торф на Беларусі пачынае зьяўляцца ўжо асноўнай энэргетычнай і часткова сырцовай базай нашай індустрыялізацыі. Нам патрэбна дапамога з боку ЦК УсеКП(б) дзеля таго, каб выкарыстаць гэту асноўную базу ня толькі як базу энэргетыкі, але і як сырцовую базу, каб дапамагчы нам паставіць на прамысловыя рэйкі вывучэньне і разгортваньне праблем торфу ў галіне хімічнай яго пераапрацоўкі: газафікацыя, каксаваньне, выпрацоўка такіх сырцовых элемэнтаў, на якіх маглі-б вырастаць буйныя індустрыяльныя прадпрыемствы. На Беларусі пакуль, што мы не знайшлі (трэба думаць, што няма) руды, мэталю і вугалю, таму ў нас торф зьяўляецца ключом індустрыялізацыі БССР. Прыкладам зьяўляецца Асінбуд і другая раённая электрастанцыя, якая будуецца ў Гомелі, якія на сутнасьці створаць тэхнічны пераварот у нашай прамысловасьці. Але гэта толькі першыя крокі ў выкарыстоўваньні торфу, як энэргетычнай базы. Мы павінны паставіць на ўсіх парах праблему выкарыстоўваньня торфу, як базы сырцовай. Для вырашэньня гэтай праблемы нам патрэбна яшчэ большая дапамога з боку ЦК УсеКП(б).

Мы ставім перад сабой задачу разгортваць буйныя камбінаты на торфе і ад цэнтральнага камітэту УсеКП(б) мы просім падтрыманьня ў гэтай справе.

Мы можам даць таксама прыклады скарыстаньня электра-энэргіі ў сельскай гаспадарцы. Гэтую справу мы павінны таксама разгортваць пры дапамозе ЦК УсеКП(б).

Мы ставім перад сабой задачу, якая таксама стаіць перад усім Савецкім Саюзам—гэта вырашэньне праблемы разьвіцьця ўласнай («отечественной») машынабудоўлі. Зусім правільная зьяўляецца палітыка ЦК УсеКП(б), у якой адным з галоўных пунктаў ставіцца задача пашырэньня машынабудаўніцтва ўнутры Саюзу ССР з тым, каб гэтым самым хутчэй вызваліцца ад эканамічнай залежнасьці капіталістычных дзяржаў. І ў гэтай справе Беларусь таксама можа адыграць пэўную ролю ў тых адносінах, што, калі асноўныя індустрыяльныя цэнтры нашага Савецкага Саюзу будуць абслугоўваць важнейшыя аб'екты саюзнай індустрыі, дык мы ўжо наладзілі ў сябе і можам далей пашырыць такую галіну мэталяапрацоўчай прамысловасьці, як сярэдняе машынабудаўніцтва, выраб с.-г. машын, выраб шляхавага інвэнтару, выраб стандартных прылад для індустрыялізацыі працэсаў самага будаўніцтва, якое ў нас часта праводзіцца яшчэ прадзедаўскімі мэтадамі. Мы ўжо маем значныя посьпехі ў разьвіцьці гэтых галін прамысловасьці. Нашы паўсаматужныя ў былым прадпрыемствы, як напрыклад, «Энэргія», «Камунар», «Пралетары» і «Сельмаш» у Гомелі, завод імя Ланцуцкага, завод «Чырвоны Мэталісты» у Віцебску—ужо даўно перабудаваны і зьяўляюцца зараз досыць буйнымі ў нашых прадпрыемствамі, якія адыгрываюць вялізарную ролю ў справе вырабу сродкаў вытворчасьці і абсталяваньня для задач індустрыялізацыі БССР.

На лініі разьвіцьця сярэдняй мэталяапрацоўчай прамысловасьці мы, пры дапамозе ЦК УсеКП(б), павінны таксама адыграць тую ролю, якая адведзена Беларусі ў вырашэньні гэтай важнейшай для УсеКП(б) праблемы разьвіцьця ўнутранога машынабудаўніцтва і ў нашым Савецкім Саюзе.

Вось што, памойму, зьяўляецца асноўным (аб тэкстыльнай прамысловасьці я буду гаварыць далей) для разьвіцьця індустрыялізацыі БССР, як часткі Савецкага Саюзу на фоне тэй справаздачы ЦК УсеКП(б), якую мы заслухалі.

Дазвольце мне коратка зараз спыніцца на пытаньнях калектывізацыі. Каб не паўтарацца з раней выступаўшымі таварышамі, я коратка павінен адзначыць, што ў гэтай галіне наша партыя мае ня́змерна вялікія дасягненьні. У галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі збожжавая праблема, якая стаяла перад нашай партыяй як цэнтральная праблема, зараз у асноўным ужо вырашана праз арганізацыю буйнога аграмаджанага сацыялістычнага зямляробства, выражаецца на базе калектывізацыі. Перад нашай партыяй стаяць зараз задачы вырашэньня мясной, жывёлагадоўчай праблемы і праблемы разьвіцьця тэхнічных культур. 40-50 проц. калектывізацыі ў збожжавых раёнах, сэўбы пановаму робяць расстаноўку клясавых сіл у вёсцы, як аб гэтым гаварыў т. Мануільскі. І калі мы ўчытаемся ў тэзісы, зацьверджаныя палітбюро аб выніках калектывізацыі і разьвіцьці сельскае гаспадаркі, мы ўбачым, што наша партыя за пэрыяд ад 15 да 16-га зьезду ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі па сутнасьці адкрывае новую старонку ленінскай тэорыі, новую старонку марксызму-ленінізму ў пытаньнях апоры савецкай улады ў вёсцы. У тэзісах гаворыцца, што зараз ужо ў асноўных збожжавых раёнах пановаму ставіцца задача апоры савецкай улады на вёсцы; у тэзісах гаворыцца, што апорай на вёсцы зьяўляюцца калгасьнікі, новыя аб'яднаныя сілы, якія кансалідуюцца на новых сацыялістычных вытворчых адносінах, на базе калгасаў, на базе аграмаджанай працы, аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці. Гэта новая старонка марксызму-ленінізму, гэта тое новае, чаго ня бачыў увесь сьвет. Практыка работы нашай партыі за апошні пэрыяд абагачае тэорыю марксызму-ленінізму новымі паглыбленым матар'ялам, новымі фактамі. Міма гэтага ня можа прайсьці камуністычны рух усяго сьвету. На гэтым вопыце будуць вучыцца ўсе сэкцыі Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Таварышы! Гэтыя посьпехі былі-б яшчэ большымі ў справе калектывізацыі, калі-б мы нарабілі менш памылак. Я ня буду паўтараць таго, што ўжо гаварылі да мяне ад памылкаў і яшчэ будзем гаварыць на дакладу ЦК КП(б)Б, а скажу толькі, што мы павінны ад імя ўсёй КП(б)Б заявіць Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б), што ЦК УсеКП(б) ад пачатку да канца правільна і пабальшавіцку кіраваў гэтай важнейшай, рашаючай, маючай гістарычнае значэньне справай калектывізацыі.

Мы, таварышы, ведаем пра спробы правых апартуністых узваліць памылкі, зробленыя на мясцох, у тым ліку абласнымі і нацыянальнымі партыйнымі арганізацыямі, зваліць на плечы нашага ЦК УсеКП(б) і іншых—самім падарваць давер'е да кіраўніцтва нашай партыі. Я не намылюся, калі скажу, што гэтыя спробы апартуністых і іх памочнікаў «левых» загібшчыкаў, як з боку ўсёй партыі, так і з боку КП(б)Б, сустрэнуць самы энэргічны і бязьлітасны адпор, і ўся КП(б)Б разам з усёй партыяй зможа пастаяць за свой цэнтральны камітэт усесаюзнай камуністычнай партыі і ня дасьць нікому зваліць свае апартуністычныя вывіхі на наша кіраўніцтва, каб гэтым самым яго дыскрэдытаваць. Мы заявілем, што лінія ЦК УсеКП(б) у справе калектывізацыі, у справе генэральнага пераўтварэньня сельскае гаспадаркі па сацыялістычны лад зьяўляецца ад пачатку да канца правільнай.

Зусім правільна адзначыў т. Мануільскі і тыя памылкі, якія зроблены ЦК КП(б)Б. Мы, таварышы, павінны сказаць, што ЦК КП(б)Б пры правільнай у асноўным лініі ў справе калектывізацыі, зрабіў наасобныя палітычныя памылкі. У нас таксама крыху закружылася галава ад посьпехаў. Мы свае памылкі самі сваячасова прызналі і выправілі. І зусім ня дзеля таго, каб паслабіць пазыцыі крытыкі нашых памылак з боку ЦК УсеКП(б), ці з боку членаў КП(б)Б. Не, ЦК УсеКП(б), як і ўся партыйная маса, павінны крытыкаваць нашы памылкі, якія мы прызналі, крытыкаваць і выкрываць далей тыя, якіх мы самі яшчэ не заўважылі.

Наш Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выправіў гэтыя памылкі з бальшавіцкай сьмеласьцю і рашуча прызнаўся ў іх, выходзячы з неабходнасьці больш рашучага забесьпячэньня правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі ў гэтым важнейшым пытаньні. Вось гэта было асноўнай кіруючай падставай, якая кіравала намі пры выкрыцьці нашых уласных памылак, што мы мелі. Адначасова мы павінны заявіць, што ЦК КП(б)Б сваячасова стаў на барацьбу з загібамі і памылкамі, якія дапушчаны на мясцох, выкрываючы ў той-жа час і свае ўласныя памылкі.

Я хацеў-бы толькі ў сувязі з гэтым сказаць, што і мясцовым арганізацыям, нарабіўшым памылак у справе калектывізацыі, ня трэба хавацца за наасобныя памылкі ЦК КП(б)Б. Трэба, выкрываючы гэтыя памылкі, прызнаваць іх, не хавацца за сьпіной ЦК КП(б)Б, таксама, як і УсяКП(б) не павінна хавацца за сьпіною ЦК УсеКП(б). Толькі пры такіх умовах мы зможам гарантаваць правільнае правядзеньне лініі нашай партыі, лініі бальшавіцкага ЦК УсеКП(б).

Важнейшымі праблемамі, якія ставіць перад сабой КП(б)Б у разьвіцьці сельскае гаспадаркі, зьяўляюцца наступныя праблемы, на якія просім ЦК УсеКП(б) зьвярнуць увагу і дапамагчы нам іх вырашыць. Першае—гэта жывёла. Мы можам па разьвіцьці жывёлагадоўлі зьявіцца адным з асноўных раёнаў Саюзу, асабліва па разьвіцьці сьвіней. Другое—гэта праблема разьвіцьця лубяных культур (ільну, канапель), і ў сувязі з гэтым разьвіцьцё тэкстыльнае прамысловасьці. Узмацніўшы мэліярацыю, мы зможам зьявіцца асноўным раёнам СССР па разьвіцьці тэхнічных культур. Па гэтых пытаньнях нам трэба яшчэ большае падтрыманьне ЦК УсеКП(б).

Апошняе пытаньне, на якім я хачу спыніцца, гэта пытаньне адносна нацыянальнай палітыкі, якую праводзіў ЦК УсеКП(б). Я на гэтым пытаньні прымушаны спыніцца таму, што, мне здаецца, з боку некаторых таварышоў тут у іх выступленьнях былі дапушчаны па меншай меры «нетактычныя» (выбачайце за такі скромны выраз) выпады. Вопыт 12-цігадовай работы нашай партыі паказаў самым выразным чынам, што ЦК УсеКП(б) у нацыянальным пытаньні (як і ў другіх пытаньнях) стаіць на ленінскіх пазыцыях. Тыя дасягненьні, якія мае Савецкая Беларусь, як нацыянальная распубліка, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і УсеКП(б), на сёньнішні дзень выразна паказваюць вялізарнейшую ўвагу, якую зварачаў ЦК УсеКП(б) на гаспадарчы і культурны ўздым нацыянальных распублік і абласьцей. Вось вам некаторыя канкрэтныя лічбы. У мэліярацыі па БССР за апошнія 3 гады ўкладаліся наступныя сумы: у 1927-28 годзе каля 1 млн. руб., у 1928-29 годзе—2 млн. руб., а ў 1929-30 годзе—7 млн. руб. На 1930-31 год мы праектуем 30 млн. руб. Хто бачыў такія тэмпы? Калі таварышы прад'яўляюць прэтэнзіі да ЦК УсеКП(б), дык яны забываюць, што мы ня ўмеем самі нават цяніць таго, што мы робім, чаго мы дабіліся пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б).

Таварышы! Нядаўна ва украінскіх газэтах адзін прафэсар апісаў нашу мэліярацыю. Ён піша, што такога размаху работ па асушальнай мэліярацыі, якая праводзіцца ў БССР (а фінансаваньне яе праходзіць па саюзным бюджэце), ня бачыў яшчэ сьвет. Мы атрымалі заключэньне ад Дзяржпляну Саюзу адносна мэліярацыі, і ў гэтым заключэньні гаворыцца, што, паколькі такіх маштабаў асушальнай мэліярацыі, якая праводзіцца зараз на Беларусі, яшчэ ні бачыў сьвет, трэба яе праводзіць, як вопыт гіганцкага значэньня. І сапраўды, таварышы, калі экспэдыцыя Жылінскага ў дарэвалюцыйныя часы правяла на тэрыторыі сучаснай БССР, на Палесьсі, канал у 60 кілём., дык навуковая літаратура ўсяго сьвету ў адзін голас бубніла аб гэтым. А мы за апошнія гады нашага будаўніцтва правялі асноўных магістральных каналаў, па якіх ня толькі асушаем балоты, але і сплаўляем лес, 425 клм. А калі мы яшчэ ажыцьцёвім плян бягучага году, дык гэта лічба амаль што падвоіцца. Як-жа можна недаацэньваць такіх фактаў?

Другі прыклад. Валавая прадукцыя па цэнзавай прамысловасьці БССР у цэнах 1926-27 г. складала: у 1925-26 г. —108,4 млн., у 1926-27 г.—126,9 млн., у 1927-28 г.—176,3 млн., у 1928-29 г.—257,3 млн., у 1929-30 г.—425 млн. руб. А ў 1930-31 г. мы мяркуем мець валавой прадукцыі па цэнзавай прамысловасьці на суму 850 млн. руб. Процант росту валавой прадукцыі па гэтых гадох выглядае наступным чынам: 26-27 г.—113,4 да папярэдняга, 27-28 г.—138,8 проц., 28-29 г.—145,8 проц., 1929-30 г.—165,1 проц. Удельная вага прамысловай прадукцыі (па цэнзавай) у адносінах да прампрадукцыі ўсяго СССР выглядае па гэтых-жа гадох так: 1,1 проц., 1,3 проц., 1,43 проц., 2,13 проц.—значыцца, мы расьцем хутчэй сярэдняга тэмпу па Саюзе.

Такі-ж малюнак і з ростам асноўных фондаў, удельная вага якіх у нас павышаецца з кожным годам.

Таварышы, калі тут раздаваліся рэплікі т. Мануільскаму, што мы даем такія тэмпы таму, што нібыта Беларусь расьце ад нуля, дык гэта зусім няправільны матыў. Сёньня мы павінны ўжо адкінуць гэты матыў у архіў, у гісторыю, бо мы ўжо не ад нуля расьцем такімі тэмпамі, а мы расьцем такімі тэмпамі ад соцень мільёнаў прадукцыі па цэнзавай прамысловасьці. 425 млн. руб. валавой прадукцыі—гэта ўжо ня пуль. Мы расьцем гіганцкімі тэмпамі, маем вялізарнейшыя дасягненьні.

Такім чынам, таварышы, вы бачыце, што мы пераганяем сярэднія тэмпы на Савецкім Саюзе, г. зн., што мы пераганяем нават тыя вялізарныя тэмпы нашага Саюзу, якіх яшчэ ня бачыла ніколі ні адна капіталістычная краіна.

Ці-ж можна недаацэньваць гэтых лічбаў?

Такім чынам вы бачыце, таварышы, што з боку Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і ўсіх саюзных органаў аддаецца сур'ёзная ўвага нацыянальным распублікам. Ці можна, напрыклад, недаацэньваць такога моманту, што ў нас у БССР уведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне, пакуль што гэта ўведзена ў адной БССР з усіх савецкіх распублік. Гэта мы здолелі зрабіць толькі дзякуючы дапамозе ЦК УсеКП(б), дзякуючы дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу.

Наш мясцовы і дзяржаўны бюджэт у 1929-30 г. складае ўжо 1/4 мільярда руб., а ў 1924-25 г., калі не памыляюся, ён складаў ўсяго 12 мільёнаў.

У нас вырастаюць Асінбуды, буйныя заводы і фабрыкі, фабрыка штучнага валакна (адна з шасьці па Савецкім Саюзе), растуць кадры пралетарыяту. Усё гэта мы маем зноў такі дзякуючы вялізарнай увазе з боку ЦК УсеКП(б) і Саюзнага Ураду.

І калі нашы беларускія нацыянал-дэмакраты імкнуцца давесьці, што мала даюць дапамогі, ці прабуюць здабыць тыя «ільготы» для нацыяналістычнай інтэлігенцыі, якія давала калісь наша партыя ўсходнім савецкім распублікам і гэтымі «запатрабаваньнямі» імкнуцца адвяваць сабе «ўступачкі» і апраўдаць сваю апартуністычную мазьню, дык мы ім кажам: «не раўняйцеся па тых усходніх рэспубліках, дзе яшчэ існуюць сярэднявяковыя вытворчыя адносіны і дзе яшчэ носяць «чадру».

У нас ужо ёсьць кадры рабочай клясы, у нас уведзена ўсеагульнае навучаньне, мы ўжо апіраемся на пралетарыят. Так што ня можна раўняць БССР да ўсходніх украінных распублік (Якутыя і інш.).

Вось чаму ня маюць рацыі тыя таварышы, якія ў сваіх выступленьнях далі такі малюнак, што нібыта Беларусь у саюзных органах ня мела ніякага падтрыманьня.

Было-б зусім памылкова наасобнымі шурпатасьцямі, якія часамі сустракаюцца ў Савецкім апараце пры правядзеньні нашых гаспадарчых пляноў, затлумініць тую вялізарную ўвагу, якую надае нацыянальным абласьцям і распублікам Цэнтральны Камітэт і ўсе саюзныя кіруючыя савецкія органы.

На гэтым канчаю. Адзначаю, што ўсе гэтыя дасягненьні, якія мае ўся наша партыя, дасягнуты толькі таму, што ЦК УсеКП(б) непарушна стаіць на ленінскіх пазыцыях ва ўсіх пытаньнях міжнароднай і ўнутранай пралетарскай палітыкі. ЦК правільна адзначае перспэктывы міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. ЦК правільна і рашуча змагаўся, як ленінскі штаб, за чыстату нашай камуністычнай партыі, за адзінства нашай партыі, за чыстату лініі Камуністычнага Інтэрнацыяналу; ЦК дашчэнту разьбіў контр-рэвалюцыйны трацкізм, рашуча змагаўся з правым апартунізмам і нанёс яму руйнуючы ўдар. І таму наша партыя зараз, як ніколі, маналітная ідзе на XVI зьезд.

Мы запэўнім наш ЦК УсеКП(б) ад імя XIII зьезду, КП(б)Б, што і ўся КП(б)Б, якая працуе на адказьнейшым вучастку Савецкага Саюзу—на мяжы з капіталістычным Захадам, будзе і надалей адным з лепшых баявых атрадаў уссаюзнай камуністычнай партыі і ЦК УсеКП(б) заўсёды будзе апірацца на нашу арганізацыю ў правядзеньні сваёй ленінскай палітыкі.

Мы гатовы заўсёды даць рашучы адпор усякім апартуністым. (Воплескі).

Прамова тав. Славінскага

Сучаснае міжнароднае становішча высоўвае перад УсеКП(б), перад нашай партарганізацыяй і XIII зьездам КП(б)Б асабліва важныя задачы.

Мы знаходзімся на мяжы, мы пераживаем момант, калі эканамічны і палітычны крызіс, як у дзяржавах буйных, дзяржавах моцна разьвітага капіталізму, таксама і лімітрофах, нарастае шпаркім тэмпам, абвастраючы да крайнасьці клясавыя супярэчнасьці, надзвычайна ўскладняючы міжнароднае абстаўленьне і ўтвараючы ўсё больш рэальную пагрозу вайны. Работа нашага XIII зьезду і работа XVI зьезду Усесаюзнай Камуністычнай партыі будуць адбывацца ў момант шпарка нарастаючага рэвалюцыйнага контр-наступленьня працы на капітал, адным з важнейшых стымулаў якога зьяўляецца нячуваны размах і тэмпы будаўніцтва краіны сацыялізму. Адгэтуль, зразумела, супраціўленьне, шалёнае цкаваньне і рад рашучых мер, якія прымаюцца капіталізмам для зрыву будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Паход на наш экспарт, затрудненьні крэдытаваньня і рад іншых мер зьяўляюцца лепшым довадам гэтага, нашы экспартныя труднасьці і труднасьці крэдытаваньня ня могуць ня ўплываць у напрамку ўзмацненьня ўскладненьняў і труднасьцяй, якія стаяць перад партыяй і рабочай клясай Савецкага Саюзу.

Наш зьезд павінен прайсьці пад знакам таго, што, ня гледзячы на труднасьці, якія мы перажываем, што ня гледзячы ні на якія труднасьці, мы павінны напружваць усе сілы, каб у далейшым узмацняць сацыялістычную перабудову нашай сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі.

У сувязі з гэтым асабліваю важнасьцю і асаблівую вострасьць набывае пытаньне зьнішчэньня тых памылак, якія зьяўляюцца скажэньнямі правільнай партыйнай лініі у такім складанейшым пытаньні, як калектывізацыя сельскае гаспадаркі. Асабліва ў галіне ўзмацненьня работы з беднатой, мы яшчэ пасапраўднаму работы не разгарнулі.

Павінна быць нясупынная дбайнасьць, нясупынная партыйнае кіраўніцтва і няўхільная работа для таго, каб мы маглі замацоўваць тое, што маем, маглі ісьці наперад да бурнага далейшага росту калектывізацыі ў нашай рэспубліцы.

Перад намі асабліва востра стаіць пытаньне барацьбы з правай небясьпекай, якая, як і раней, застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Правыя ў сучасны момант імкнуцца скарыстаць любы вучастак, любыя труднасьці ў нашай рабоце для падрыхтоўчай работы супроць партыі. Мы павінны, не закрываючы вачэй, сказаць аб вялікіх труднасьцях, якія мы маем і якія ў нас будуць сустракацца ў далейшым. Пытаньне рабочага забесьпячэньня ў сучасны момант зьяўляецца адным з вострых пытаньняў. Трэба проста сказаць, што справа з рабочым забесьпячэньнем знаходзіцца не на належнай вышыні, і мы яшчэ рашучага пералому ў гэтых адносінах ня маем, хоць і шмат робім. Мы маем яшчэ сям-там «вздохи» на прышчэпаўшчыне. Правям прышчэпаўшчыны трэба і надалей даваць рашучы адпор, бо прышчэпаўшчына ва ўмовах БССР зьяўляецца адной з праяў правай небясьпекі.

ПРАЦЯГ ГЛЯДЗІ НА ДРУГОЙ СТАРОНЦЫ

Пастанова зьезду па дакладу тав. Трылісэра аб рабоце ЦКК УсеКП(б)

Заслухаўшы даклад тав. Трылісэра аб рабоце ЦКК УсеКП(б), XIII зьезд КП(б)Б прызнае лінію Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі правільнай і ўхваляе ўсю работу ЦКК УсеКП(б) за пэрыяд ад XV зьезду УсеКП(б).

Дзеньнік зьезду

Ранішняе пасяджэньне амаль цалкам было прысьвечана абгаварэньню дакладу **Трылісера** аб дзейнасьці і рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі УсеКП(б). Па дакладу т. Трылісера выступалі т. т. **Нартыш-Блук, Ласман, Рыскін, Казачонак, Мызін, Ярмолін, Кудзелька, Аверын, Букарскі, Сташэўскі, Скорбут, Яфімаў і Ляўкоў.**

Пасьля выступленьняў гэтых таварышоў зьезд заслухаў заключнае слова т. Трылісера. Палітычная лінія і практычная работа Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі УсеКП(б) зьездам поўнасьцю ўхвалена.

Для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладу абрана камісія ў складзе наступных 25 таварышоў: **Трылісер, Рыскін, Зелянноўскі, Зільбэрман, Скробут, Стронгін, Унгур, Ляўкоў, Мальцава, Разумаў, Рыхцер, Мышалаў, Жураўлёў, Згле, Пасюкевіч, Казачонак, Сарожнікава, Кудзельна, Сташэўскі, Самойлаў, Сянкевіч, Калодка, Сьмірноў, Мундау, Сьвірыдаў.**

У канцы ранішняга **пасяджэньня** зьезд віталі прыбыўшыя **калгасьнікі** з розных округ БССР.

З прывітальнымі прамовамі выступалі: ад членаў польскага калгасу «Чырвоны Прамень» (Бабруйская акруга) — т. **Рудкоўскі;** ад калгасьнікаў Сенепскага раёну (Віцебскай акругі) — т.т. **Лучынскі і Квяткоўскі;** ад латыскага калгасу — **т. Аўсевіч.**

На прывітаньні калгасьнікаў ад імя зьезду з адказнымі прамовамі выступалі т.т. **Бэнэк** (на польскай мове) і **Ігнатоўскі.**

На вячэрнім пасяджэньні з палітычнай справаздачай Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б выступіў т. **К. В. Гей.**

Дэлегаты XIII зьезду КП(б)Б

1. Тав. ЮДОВІЧ, работніца ф-кі «Дзьвіна» (Віцебск), 2. т. ЧЫХНОВІЧ, рабочы Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, 3. т. ГАЗ, сакратар партканцыры Гомельскага саюзу будаўнікоў, 4. т. ХАЙТАНОВІЧ — рабочы Гомельскай шэйнай ф-кі.

Рабочыя уступаюць у партыю

1. тав. РАМ—рабочы заводу «Дрэваапрацоўшчык», працуе на вытворчасьці 24 гады, ударнік, уступіў у партыю перад XIII зьездам; 2. т. БУРЛО—рабочы заводу «Дрэваапрацоўшчык», камсамолец, 5 год на вытворчасьці, уступіў у партыю перад зьездам; 3. т. МАНЮК — рабочы Гомельскага заводу імя Ланцуцкага; 4. т. ЛІБО—рабочы заводу «Дрэваапрацоўшчык», ударнік, 46 год на вытворчасьці, уступіў у партыю перад XIII зьездам партыі.

Фізкультурнікі вітаюць XIII зьезд КП(б)Б

На здымку Аршанская каманда фізкультурнікаў

На здымку Менская ка

XIII зьезд КП(б)Б

Спрэчкі па дакладу тав. Мануільскага аб рабоце ЦК УсеКП(б)

Прамова тав. Славінскага

(ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК ГЛЯДЗІ НА 1-Й СТАРОНЦЫ.)

Мы павінны ўзяць рашучы курс на выхаваньне нашых маладых партыйных кадраў. За апошні час мы маем надзвычайны ўздым актыўнасьці прадстаўнікоў, які асабліва адчуваецца ў выкананьні прамфінпляну. Праўда, на асобных участках ёсьць яшчэ прарывы, на зьнічэньне якіх трэба зварачаць яшчэ больш пільную ўвагу.

Мы маем надзвычайны прыцёк у партыю рабочых з вялікім вытворчым стажам, але ў пытаньні нашай партыйнай вучобы мы не даволі робім. Я ня ведаю, як гэта справа ў іншых акругах, але мне здаецца, што мы асабліва ня маем тэй значнай работы, якая павінна быць праведзена ў даным напрамку, асабліва ў вёсцы. Трэба сказаць, што сёньня вучобу сярод партыйцаў мы правялі. Што азначаюць нашы дробненькія ў гэтым напрамку посьпехі. Гэта нічога не азначае ў параўнаньні з тымі складанейшымі задачамі, якія партыя зараз заклікана вырашаць. Перад намі стаць вялікія задачы ў гэтай галіне. Партыя і наш зьезд ня могуць прайсьці міма гэтых пытаньняў. Мы павінны паставіць гэта пытаньне з усёй вострасьцю, мы павінны дабіцца перамогі.

У галіне работы з беднатой у нас ёсьць цэлы рад недахопаў. З беднатой не займаюцца, матыўнуючы гэта тым, што, бачыце, беднота ад нас нікуды не ўцячэ. Такія разважаньні дапамагаюць і садзейнічаюць кулацкім элементам пашыраць свой уплыў. У рабоце сярод бедноты і батрацтва мы апошнім зрабіць рашучы пералом.

Трэба сказаць, што на пытаньні самакрытыкі таксама не зварачалася даволі ўвагі. Нашы арганізацыі невыстарчальна разгарнулі самакрытыку. Самакрытыка нам патрэбна асабліва ў гэты перыяд, калі мы дапусьцілі рад памылак, недахопаў. Для таго, каб гэтыя памылкі хутчэй ліквідаваць і пераробіць для далейшай работы, неабходна пашырыць самакрытыку. Праса ў БССР у гэтым напрамку зрабіла рад грубейшых памылак, слаба і нездавальняча разгортваючы самакрытыку. Некаторыя таварышы кажуць, што самакрытыка гэта рэч добрая, але, крытыкуючы, трэба прайляць асьцярожнасьць, каб «не перакрытыкавацца». Гэта зусім няправільная ўстаноўка. У пытаньнях самакрытыкі ў нас часта няма тэй бальшавіцкай вострасьці, якая павінна быць.

Мы павінны яшчэ больш узмацняць нашу работу як на палітычным, так і гаспадарчым і на культурным франтох. У нас павінна быць праведзена вялікая работа ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці савецкай краіны.

На XIII зьезьдзе ўсе гэтыя пытаньні павінны быць пастаўлены в надзвычайнай глыбінёй і рэзкасьцю. Увесь наш зьезд павінен праходзіць пад знакам бязьлітаснай, бальшавіцкай самакрытыкі і выпраўленьня недахопаў. (Воплескі).

Прамова тав. Арашчука

Тыя тэмпы, з якімі праходзіць выкананьне пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі, тое, што партыя дапусьціла разьбіла рэшткі контррэвалюцыйнага трацкізму, рашуча ўскрывала і ўскрывае і вядзе барацьбу з «левымі» загібамі, тое, што партыя рашуча вядзе барацьбу з правым ухілам—галоўнай небясьпекай на даным этапе, нацьвярджае правільнасьць тэй палітычнай лініі, якую праводзіў Цэнтральны Камітэт. Да свайго XVI-га зьезду партыя падыходзіць яшчэ больш згуртаваная вакол свайго Цэнтральнага Камітэту.

Будаўніцтва новых прадпрыемстваў, рост прадукцыі на 72 проц., будаўніцтва Бабруйскага камбінату, электрастанцыі імя тав. Сталіна—усё гэта гаворыць аб палітычнай увазе з боку Савецкага Саюзу нацыянальным рэспубікам, у прыватнасьці БССР. Тыя, посьпехі, якія ў сувязі з гэтым набыты ў нас, у БССР, бясспрэчна зьменшылі колькасьць беспрацоўных, паленшылі матар'яльна-культурнае становішча рабочае клясы і асноўных бяднякоў-серадняцкіх мас вёскі, гэтыя посьпехі далі магчымасьць павялічыць колькасьць рабочае клясы ў нас, на Беларусі.

Гаворачы і адзначаючы ўсе гэтыя посьпехі, мы павінны паддаць жорсткай пралетарскай самакрытыцы тыя асобныя ўстановы гаспадарчыя і савецкія, якія да гэтага часу не дабіліся выразнасьці ў сваёй рабоце на выкананьні дырэктыў ЦК нашай партыі.

Я тут хачу гаварыць аб прамысловых кадрах, аб кадрах для культурнага абслугоўваньня рабочых мас, аб кадрах для калгаснага будаўніцтва і інш. Праблема кадраў у нас стаіць асабліва востра. ЦК КП(б)Б адносна гэтага ўжыў рад мерапрыемстваў. Але мы сваімі сродкамі, сваімі сіламі, ня зможам падаволіць тыя патрэбы, якія высоўваюцца шпаркімі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва. Таму ЦК УсеКП(б) павінен у далейшым зьвярнуць увагу на напаўненьне нашае КП(б)Б пралетарскімі кадрамі. Нашы кіруючыя органы, і тыя органы, якія працуюць на забесьпячэньні сельскай гаспадаркі машынамі, працуюць ня досыць выразна. У БССР прыслалі плугі, прызначаныя для Сібіры. У нашых умовах яны зусім для работы непрыгодныя. Гэта выразны факт таго, што ў рабоце гэтых устаноў трэба дабіцца большай выразнасьці.

Чагоўнае пытаньне, на якім лічу патрэбным застанавіцца — гэта кіраўніцтва транспартам. У нас на чыгунцы столькі бюракратызму, столькі цягаціны, што бадай большага ня знойдзеш ні ў якай другой галіне гаспадарчага кіраўніцтва. У рабоце кіруючых органаў чыгункі надзвычайна многа інтэрнасьці, надзвычай многа непаваротлівасьці. Я тут хачу падаць канкрэтны прыклад. Партыйны калектыў Віцебскага чыгуначнага вузла і акруговы камітэт партыі, разглядаючы пытаньне аб кіраўніцтве чыгункай, канстатавуў рад прарываў і даў адпаведную ацэнку таму становішчу, якое мела месца на вузле. **Праўленьне МБВ чыгунак на чале з тав. АРНОЛЬДАВЫМ, адным рошчаркам пяра або праз свайго намесьніка ці тэхнічнага дырэктара закрэсьлівае, не згадзаецца з пастановамі партыйных органаў.** Партыйны камітэт выносіць пастанову, дае ацэнку асобным фактам, а праўленьне МБВ чыгунак, на чале з членам партыі **Арнольдавым**, не прыслухоўваецца да голасу партыйнага камітэту. Гэта нікуды ня варта, па такіх недапушчальных адносінах да голасу партыйнага калектыву і акруткому партыі трэба жорстка ўдарыць. Меў месца яшчэ і такі факт.

Партыйны камітэт дае ацэнку аднаму спэцу, як шкодніку, які разбурае чыгуначную гаспадарку, а тав. **АРНОЛЬДАЎ** пасьля гэтага выносіць загадам гэтаму спэцу падзяку. Гэтыя бюракратычныя адносіны з боку **Арнольдава** да пастаноў партыйных арганізацый перашкаджаюць паладзіць кіраўніцтва на транспарце.

Прамова тав. Балціна

Шпаркі рост нашых гарадоў, рост пралетарскіх кадраў стварае абставіны, пры якіх ажыцьцяўленьне задач рабочага забесьпячэньня робіцца вельмі цяжкім. За мінулы год мы мелі прырост колькасьці прамысловых рабочых на 18 проц., у гэтым годзе на кантрольных лічбах гэты прырост вызначаецца ў 28 проц.

Наша партыя на бліжэйшы перыяд павінна будзе паставіць пытаньне рабочага забесьпячэньня, як адно з важнейшых пытаньняў. Вырашэньнем гэтага пытаньня мы павінны будзем займацца на лініі ўсёй нашай партыйнай работы.

Большасьць нашых арганізацый фактычна не ажыцьцяўляюць усіх пастаноў, якія прыняты ЦК КП(б)Б аб разьвіцьці жывёлагадоўлі, аб разьвіцьці іншых галін гаспадаркі, праз якія можна харчаваць нашы гарады. Ня гледзячы на самыя катэгарычныя дырэктывы, мы нават зараз нагледзім такое зьявішча, як забой маладняка жывёлы ў вялікіх разьмерах. Мы маем такое зьявішча, калі з асобных калгасаў цэлымі дзесяткамі адпраўляюць маладняк рагатай жывёлы на забой. Я не закраную асобных округ, а паказваю на тое, што, нават, у Менску і на акрузе мы маем цэлы рад калгасаў і саўгасаў, якія дапушчаюць выпадкі забою цялят. Мы павінны гадаваць маладняк рагатай жывёлы, бо мы сёньня ня можам разьлічваць на завоз у БССР мяса, рыбы і іншых прадуктаў з другіх раёнаў СССР.

Наша сельска-гаспадарчая кампанія, а асабліва малочна-жывёлаводчая, зараз ня можа праводзіць тыя задачы, якія на яе ўскладзены з прычыны адсутнасьці нізавое сеткі. Як на выразны прыклад яе дрэннай работы, я пакажу на тое, што па важнейшым прадукце—на загатоўцы масла выканана ня больш 4-5 проц. пляну.

Сьвіняводзтва набывае выключнае значэньне, бо буйная рагатая жывёла ня можа даць нам сёньня таго эфэкту, які можа даць сьвіняводзтва. Мы маем пастановы ЦК, маем вызначаную кантрольную лічбу аб стварэньні ў БССР да пэўнага тэрміну сьвіняводчай гаспадаркі. Але і тут работа па выкананьні дырэктывы праводзіцца дрэнна. Дрэнна працуе сьвіняводчы трэст. Няма таго, каб шпарка арганізаваць гэтую справу, выкарыстаць усе магчымасьці для гэтай справы, якім мы толькі маем.

Мне здаецца, што тут галоўная віна ляжыць у тым, што партыйныя арганізацыі гэтым пытаньнем мала цікавяцца.

Прамова тав. Хаскіна

Настанова ЦК УсеКП(б) ад 15-га мая на пытаньні аб рабоце спажывецкай кааперацыі вызначае цэлы рад мерапрыемстваў па паляпшэньні забесьпячэньня рабочага спажыўца. Мы зараз на гэтую галіну работы зварачаем вялікую ўвагу. Устаноўка, якая даецца ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 15-га чэрвеня гаворыць аб тым, што нагорпаньне ў рабочым забесьпячэньні не зьяўляецца толькі зьявішчам аб'ектыўнага парадку, а зьяўляецца вынікам дрэннай работы арганізацый, якія працуюць па забесьпячэньні.

Далей я хачу закрануць пытаньне адносна падрыхтоўкі кадраў. Зараз адчуваецца рад інстытутаў для падрыхтоўкі кадраў для кааперацыйных арганізацый. Маецца на мэце адчыніць да дзевяці такіх інстытутаў у розных рэспубліках і абласьцёх па лініі спажывецкай кааперацыі. ВССР у даным выпадку абойдзена, ня гледзячы на тое, што ў нас з кадрамі работнікаў для кааперацыі справа стаіць надзвычайна дрэнна. Нарэшце некалькі слоў аб якасьці прадукцыі. «Экономическое обозрение» канстатуе, што якасьць тэкстыльнай прадукцыі ў нас нагоршылася ў параўнаньні з якасьцю мінулых гадоў. Трэба са ўсёй катэгарычнасьцю падкрэсьліць, што якасьць прадукцыі па цэлым радзе тавараў настолькі нагоршылася, што на сёньнешні дзень адыгрывае не малую ролю ў пытаньні дэфіцытнасьці і ў пытаньні рэальнай зарплаты рабочых. На гэтую справу трэба зьвярнуць вялікую ўвагу і павесьці самую рашучую барацьбу за павышэньне якасьці прадукцыі.

Прамова тав. Стракоўскага

Лінія ЦК УсеКП(б) была правільнай, адпавядала тым задачам, якія былі пастаўлены перад партыяй апошнім XV зьездам УсеКП(б). Правільным быў той прагноз ЦК партыі, які даны ў адносінах да міжнароднага становішча. Эканамічны крызіс пацьвердзіў тыя ўстаноўкі, якія даваліся Выканкомам Камінтэрну, кампартыям капіталістычных краін. Мы зараз бачым, што рэвалюцыйны рух у капіталістычных краінах разгортваецца. У Кітаі, Індыі разгортваецца рэвалюцыйная падзеі, якія далёкім пацьвярджаюць правільнасьць даных установак.

Разам з гэтым умацоўваецца і міжнароднае становішча Савецкага Саюзу. Кітайскі канфлікт скончыўся з посьпехам для Савецкага Саюзу, дзякуючы вытрыманасьці і цьвёрдасьці тэй лініі, якая ў гэтым напрамку праводзілася нашай партыяй. Тое-ж самае можна сказаць і ў адносінах да ліквідацыі англійскага канфлікту, які меў месца да заключэньня тэй ганьдлёвай згоды з Англіяй, якую мы зараз маем.

Ня менш посьпехі мы маем і ў справе нашага ўнутранога становішча. Мы перавыконваем наш пяцігадовы план. Тут трэба памятаць тое, што гэты пяцігадовы план зьяўляецца далёкім рэальным, што актымальны варыянт становіцца фактычна мінімальным варыянтам пяцігодкі, бы мы [illegible]

ЗАВОДЗЕ «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК»

За ліквідацыю прарываў

савецкага апарату. Некаторыя работнікі, гэтыя яўныя чыноўнікі, адкрыта заяўляюць аб тым, што БССР зьяўляецца рэспублікай, якая выробляе быццам толькі адны панчохі, і таму з ёю можна не асабліва лічыцца. Такія адносіны пахнуць вялікадзяржаўным шавінізмам. Супроць гэтага трэба павесьці самую рашучую барацьбу.

Як вядома, па тэхнічных культурах БССР займае досыць значнае месца ў агульнай народнай гаспадарцы Савецкага Саюзу. Два гады таму назад мы прымалі ўдзел у балянсе на ільне амаль на 10 проц. Для нашай невялікай тэрыторыі гэта лічба не малая. Што-ж мы бачым з боку Наркамгандлю Саюзу ў адносінах да сяўбы тэхнічных культур у БССР? Перш за ўсё была ўстаноўка на безавансавую кантрактацыю, потым — 50 проц. выдачы сродкаў, нарэшце—75 проц. Такая лінія не дапамагла шпаркаму тэмпу правядзеньня кантрактацыі.

Падрыхтоўка тэхнічных кадраў у нацыянальных рэспубліках не знаходзіць належнага адлюстраваньня ў плане адпаведных саюзных органаў. На гэтае пытаньне трэба зьвярнуць адпаведную ўвагу.

Прамова тав. Клябанава

Напярэдадні XIII зьезду КП(б)Б праходзілі раённыя і акруговыя партыйныя канфэрэнцыі. Яны паказалі, што КП(б)Б згуртавана вакол генэральнай лініі партыі, што партыйныя арганізацыі адзінадушныя ва ўхваленьні правільнасьці кіраўніцтва нашай партыі. Калі мы працочым, прааналізуем асноўныя пункты палітыкі партыі, дык мы бачым, што генэральная лінія партыі была правільнай.

Партыйныя арганізацыі вялі рашучую барацьбу супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, вялі барацьбу супроць «левых» загібаў. І ў гэтай барацьбе наша партыя атрымала вялікія посьпехі і перамогі.

Далей, я лічу патрэбным застанавіцца на некалькіх пытаньнях практычнае работы. Я хачу падаць прыклад, які гаворыць аб тым, што ў нашым пляніраваньні ёсьць рад недахопаў. Буйнае прадпрыемства — завод імя Ланцуцкага (Гомель) быў даволі добра механізаваны і абсталяваны. На гэтым заводзе працавала звыш 2 тыс. рабочых высокай кваліфікацыі. Але з прычыны бюракратызму заводакіраўніцтва і бюракратызму, які выявіўся з боку асобных працаўнікоў Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін, гэты завод дайшоў да таго, што мінулай восенью лік рабочых скарацілі, накінуўшы толькі калі 400 чалавек.

А што мы маем зараз?

Зараз нам трэба напярэдадні гэта прадпрыемства, трэба зноў знайсьці 2.000 чалавек.

Усё гэта гаворыць аб недастатковай выразнасьці ў пытаньнях пляніраваньня.

Па пытаньні калектывізацыі вышэйшыя партыйныя арганізацыі ня даюць рад важнейшых дырэктыў. Гэтыя дырэктывы, надчас, на мясцох скажаліся. Праверкі-ж ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў мы як сьлед не наладзілі і таму мясцовыя партарганізацыі парабілі рад памылак пры правядзеньні калектывізацыі. Трэба ў далейшым больш увагі аддаваць справе праверкі таго, як нашы нізавыя партарганізацыі ў сваёй практычнай рабоце ажыцьцяўляюць дырэктывы партыі.

Зараз мы высоўваем вялікую колькасьць рабочых на адказную работу ў савецкі, кааперацыйны і інш. апарат. Я лічу, што работа на вылучэньне ў нас, на мясцох, праводзіцца нездавальняюча.

У выніку вялізарных посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, якія зьявіліся вынікам правільнасьці генэральнай лініі партыі, сярод рабочых мас мы назіраем вялікі энтузіязм. Рабочыя ідуць у партыю. Рабочыя з энтузіязмам рыхтуюцца да XVI зьезду. Рабочыя заводу імя Ланцуцкага далі абяцаньне, што да канца работ XIII зьезду КП(б)Б выпусьцяць паравоз. Для выпуску паравозу патрэбна 12 дзён, рабочыя запэўнялі, што яны гэтую работу выканаюць за 6 дзён. Усё гэта робіцца на ініцыятыве саміх-жа рабочых.

Гэты факт выразна характарызуе той нябывалы ўздым энтузіязму рабочае клясы, які мы маем на сёньнешні дзень.

Прамова тав. Міроненка

За апошнія два з паловаю гады ўся работа нашай партыі адбывалася ў надзвычай складаных абставінах, у абставінах жорсткай клясавай барацьбы як у горадзе, так і на вёсцы. Партыя з посьпехам, ня гледзячы на рад труднасьцей, справілася з усімі гэтымі задачамі, якія перад ёю паўставалі, партыя з посьпехам правяла барацьбу з правым апартунізмам, «левымі» загібшчыкамі і прымірэнчымі адносінамі да іх.

У краіне абвастрылася клясавая барацьба, капіталістычныя элементы вёскі выпрабоўвалі ўсе мэтады барацьбы супроць мерапрыемстваў партыі, ужывалі ўсе сродкі ў гэтай барацьбе. І з прычыны таго, што ў партыі яшчэ сяміх-такі засталіся элементы, якія зьвязаны з сацыяльна чужымі элементамі, яны сталі ў абарону капіталістычных элементаў горада і вёскі. Гэтыя «камуністыя» сталі рупарам дробна-буржуазных элементаў, пачалі шкодзіць нам ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі. Уся наша партыя, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, вяла жорсткую барацьбу з гэтымі апартуністычнымі элементамі, з гэтымі абарончамі капіталістычных элементаў. У гэтай барацьбе партыя мае вялізарныя посьпехі, але гэта ня значыць, што мы хоць на колькі-небудзь можам пасьпабіць сваю ўвагу і пільнасьць у барацьбе за чыстату генэральнай лініі партыі.

Цэнтральны Камітэт партыі павінен улічыць складанасьць абставін у нацыянальных рэспубліках і пры распрацоўцы перад зьезданскага матар'ялу павінен кінуць поўныя кадры для дапамогі партарганізацыям нацыянальных рэспублік.

Пытаньне аб умацаваньні нашых вясковых партыйных арганізацый патрабуе ад нас неабходнасьці сканцэнтраваць сваю ўвагу на пытаньні выхаваньня перадавых калгасьнікаў, асабліва з батракоў і беднякоў з мэтай ужыцьцяўленьня іх у партыю. Бо на даным вучастку работы некаторыя партыйныя арганізацыі адстаюць. Між тым, як яны ўмове ўзросту партыйных арганізацый вёскі, а значыць і пры іх умацаваньні, мы зможам яшчэ з большым посьпехам заманоўваць калгасны рух, зможам ахапіць ім шырэйшае кола бядняцкіх і серадняцкіх індывідуальных гаспадарак.

І апошняе пытаньне—гэта адносна кадраў. Нам для працы ў калгасах прыслалі рабочых з буйных прамысловых цэнтраў. Трэба надкрэсьліць, што тыя арганізацыі, якія паслалі гэтых рабочых—камуністых на работу ў вёску, ня трымаюць з імі сувязі. ЦК партыі трэ' будзе адносна гэтага даць дырэктыву партыйным арганізацыям, каб сувязь з паслапымі на вёску рабочымі была наладжана.

ПРАМОВЫ т. т. СЬЦЯПАНАВА, РАШЭТНІКАВА, СКРЫПКІНА, ФАСЮКА І НІКІФАРАВА БУДУЦЬ НАМІ ЗЬМЕШЧАНЫ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ.

ПРАМОВА тав. БУДЗІНСКАГА

(Адказ зд імя зьезду на прывітаньне прадстаўнікоў рэвалюцыйных працоўных Кітаю)

Таварышы! Адна кароткая, сухая тэлеграма аб тым, што адчыніўся першы зьезд Саветаў у Кітаі і наш партыйны зьезд адпадушна пасылае бялвое прывітаньне нашым братом па рэвалюцыйнай барацьбе, братом па клясе.

Прыход на XIII зьезд прадстаўнікоў рэвалюцыйных кітайскіх працоўных мас у асобе делегацыі студэнтаў, якія тут у нас вывучаюць увесь пераможны шлях савецкага пралетарыяту, выклікаў новы ўзрыў энтузіязму. Усё гэта зьяўляецца лепшым довадам тэй цеснай інтэрнацыянальнай сувязі, якая існуе паміж намі—пралетарамі БССР і пралетарамі і таксама працоўнымі масамі далёкага геаграфічна, але блізкага па рэвалюцыйнай барацьбе, Кітая. (Доўгія воплескі).

Я думаю, што правільна перадаю пачуцьці ўсіх нас, калі гавару, што ў гэтым гарачым прывітаньні, якім тут, на зьезьдзе, былі спатканы нашы таварышы—кітайскія рэвалюцыйныя студэнты—мы выказваем менавіта нашую любоў і нашу салідарнасьць з працоўным рэвалюцыйным Кітаем, якія, ня гледзячы на свае часовыя паражэньні ў барацьбе з генэральскі-компрадорска-джэнтрыйскай контр-рэвалюцыі і сусьветным імперыялізмам, ня гледзячы на ўсе здрады, ідзе наперад па тым шляху, па якім мы, пад кіраўніцтвам Леніна і нашай слаўнай УсеКП(б), прасоўваліся і перамагалі. (Працяжныя воплескі).

На гэтым шляху, па які ўсё больш цьвёрда ўстае кітайскі пралетарыят пад кіраўніцтвам сваёй Кітайскай Кампартыі і пад кіраўніцтвам Камінтэрну, ён прыйдзе да перамогі, як мы прышлі да перамогі ў Кастрычніку.

У нашай штодзённай барацьбе і працы на будаўніцтве сацыялізму ў нашым краі, мы стваралі тое, што зьяўляецца галоўным рычагом перамогі сусьветнага пралетарыяту, у тым ліку і кітайскага пралетарыяту. Ленінным довадам таго, што нашыя замежныя таварышы ўмеюць пераняць у нас тое, што зьяўляецца самым важным дзеля перамогі над клясавым ворагам—гэта сёньняшняе выступленьне кітайскіх таварышоў.

Кожны з нас у прывітаньні таварыша з Гуань - Дуня пачуў, што ён няпсска ўзброіўся аружжам, якое зьяўляецца асноўным дзеля перамогі рэвалюцыі, што ён ня кепска трымае ў руках зброю марксыцка-ленінскай тэорыі.

Сёньня, таварышы, калі ўсюды мы бачым чыньнікі разлажэньня капіталізму, калі самыя заядлыя сьпевакі капіталізму ўжо не гавораць аб стабілізацыі, калі павялічваюцца факты расхістваньня гнілой, пятрывалай, часовай стабілізацыі капіталізму, калі рабочыя масы ідуць усё больш шырокім фронтам у контр-наступленьне, мы асабліва горача вітаем прадстаўнікоў кітайскага пралетарыяту, рэвалюцыйных кітайскіх працоўных і эксплёатаемых мас, таму што яны на даным этапе выступаюць застрэльшчыкамі, што яны [illegible] першымі языкамі полымя міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі, якая разгараецца з новай сілай ва ўсім сьвеце. Гарыць паўстаньнем Індыя. У Інда-Кітаі рэвалюцыйнае бушаваньне таксама патрасае грунт сусьветнага капіталізму.

Наша рэвалюцыйная барацьба, наша сацыялістычнае будаўніцтва зьяўляцца самай дзейнай дапамогай міжнароднай рэвалюцыйнай барацьбе працоўных і эксплёатаваных мас на чале з рэвалюцыйным пр[illegible]тарыятам. Мы гэта бачым, вось чаму мы так горача віталі нашых кітайскіх братоў.

Таварышы, імперыялізм прабуе пасяяць недавер'е, парваць тую нітку міжнароднай салідарнасьці, якая пас цесна зьвязвае з працоўнымі масамі ўсяго сьвету. Сусьветны капітал прабуе нас уцягнуць у вайну і таксама ўцягнуць у гэтую вайну супроць нас масы працоўных. Мы бачылі, як на Манчжурскай граніцы, дзе адбывалася гэтая спроба ўцягнуць нас у вайну, імперыялізм нацярпеў паражэньне. Наша пераможная Чырвоная армія змагла 9 месяцаў дярпліва, з вялізарнай вытрыманасьцю стаяць на граніцы і адказваць маўчаньнем на гэтую правакацыю. Са ўсіх бакоў у буржуазным друку крычалі на нашым адрасе: бальшавікі трусяць, яны баяцца нападу [illegible]ска ўзброеных, кепска дысцыплінаваных разбойнічых банд Мукдэна. Мы гэта не зварачалі ўвагі, бо наша мета, наша задача была ня столькі біцца кітайскімі мілітарыстымі, сколькі [illegible]тацца з кітайскімі працоўнымі масамі. Мы білі генэралаў, паколькі [illegible] патрэбна было, каб іх прывесьці [illegible] чуйнасьць, мы браталіся з працоўнымі кітайскімі масамі, каб замацаваць [illegible] міжнароднай салідарнасьці. І мы ўстай барацьбе з імперыялізмам перамогі ня толькі ў тым сэнсе, што наша слаўная Чырвоная армія [illegible] два дні прагнала вялізарныя абшары, домячы супраціўленьня кітайскіх мілітарыстых, але і ў сэнсе, што мы пераканалі кітайскія працоўныя масы, нават [illegible] больш адсталыя, якія зьнуляюцца сьляпою зброяй ў руках кітайскіх імперыялістых, у тым, што мы—бальшавікі—іх браты, у тым, што мы [illegible] барацьбой вядзем іх на шлях вызваленьня і ад сваіх і ад чужых [illegible] сіляікаў і эксплёататараў.

Вось, таварышы, што галоўнае, [illegible] трэба бачыць для таго, каб мы зм[illegible]даць адпор сусьветнаму імперыялізму. Перад намі задача — працаваць [illegible] ней, шпарчэй на лёзунгу, дадзеным кітайскімі таварышамі—выканаць [illegible] годку ў чатыры гады. Яны правы, [illegible] наша Чырвоная армія, з аднаго [illegible], нашы тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, з другога—вось галоўнае рычагі нашай перамогі над сусьветным імперыялізмам.

Нахай жыве наша праца на [illegible]ваньні пяцігодкі ў чатыры гады!

Нахай жыве наша ленінская УсеКП(б)!

Нахай жыве Камінтэрн — правадыр сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Нахай жыве разгортваючаяся ў Кітаі рэвалюцыя пад кіраўніцтвам Кітайскай Кампартыі і Камінтэрну! (Працяжныя воплескі).

ЖЫВЕ КІТАЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ!

Дзень 1-га чэрвеня пачаўся звычайнай дзелавой работай. Раніцой зьезд заслухаў даклад т. Трылісера аб працы ЦКК УсеКП(б). Работа вялікая, важнейшая — работа [illegible] бальшавіцкага здароўя партыі—і дакладваць ёсьць аб чым.

Барацьба і разгром трацкізму, барацьба і разгром правага ўхілу, чыстка партыі, чыстка савецкага апарату, кадры, капітальнае будаўніцтва, прамфінпляны... паспрабуйце ўкласьці ўсё гэтыя разьдзелы ў які-небудзь рэгламант.

Тав. Трылісер шчыра імкнуўся да гэтага і ня змог: даклад заняў больш трох гадзін, хаця было відаць, што дакладчык яшчэ шмат чаго хацеў-бы сказаць. У гэты момант да Дому Культуры падъехаў чырвоны абоз калгасьнікаў Самахвалавіцкага раёну, заняўшы ўвесь завулак перад домам. Яны прыехалі прывітаць XIII зьезд, расказаць яму аб посьпехах сваёй першай бальшавіцкай вясны і падпісьці нявялікі падарунак... 6.000 пуд. жыта.

Група делегатаў выйшла з залі пасустрэч калгасьнікам. Тав. Трылісер яшчэ раз наглядзеў на гадзіньнік. Мікрафон у файэ яшчэ некалькі хвілін падхапляў словы, потым сьціх, абазваўся апляўдысмэнтамі, і зноў сьціх.

Перапынак.

* * *

Мікрафон маўчаў,—каб вечарам 1-га чэрвеня разрэзіцца бурай чалавецкіх натхненых галасоў, гарачымі, як тэмпэрамэнт рэвалюцыянэраў, воплескамі, крыкамі ўра і гарнавымі адрывістымі гукамі палкай усходняй мовы.

Не дасканальны мэталёвы мэханізм—мікрафон захлынаўся ад гэтага мора гукаў і, як-бы ад злосьці на свае бясьсільле справіцца з налягаючым шквалам гукаў, мыкнеў і пабліскваў сталью.

А заля пасылала ўсё новыя і новыя хвалі гукаў.

— Няхай жыве першы зьезд Саветаў Кітая!

— Прывітаньне гэраічным пралетарам Шанхая і Кантона!

— Ура кіткампартыі!

Заля адчула цеснату. Яна пашырылася, пагыбота, каб даць прастор шчыраму рэвалюцыйнаму інтэрнацыянальнаму пачуцьцю. Прэзыдыум і делегаты — стаялі. У вачох іскрыліся гарачыя агоньчыкі — тыя, што загараюцца ў хвіліну асаблівага ўздыму.

Хто быў прычыпай гэтага бурлівага гарачага моманту на зьезьдзе?

— Кітайская рабоча-сялянская рэвалюцыя, што з такім нябачным гэраізмам прабівае сабе дарогу да канчатковай перамогі. Сёньня яна запісае ў гісторыю сваіх першых перамог яскравыя паэтычныя словы:

30-га мая адкрыўся першы зьезд савецкіх раёнаў Кітая.

Так, — Кітай Чан Кай-шы і Гаміндана вымушан пацьсьніцца і даць месца, нягай пакуль што ў асобных раёнах, новаму чырвонаму савецкаму Кітаю. **127 завалаваных у крывавых баёх паветаў у 10 правінцыях; 13 карпусоў Чырвоной армії** колькасьцю ў 65.000 байцоў — вось рэзультат першых посьпехаў повага Кітая.

Хто скажа, што гэта мала для пачатку?

І вось тут, у залі зьезду, на эвансцэне, зьмяшаўшыся з членамі прэзыдыуму, стаяць два дзесяткі байцоў і жывых вястуноў падыходзячай пераможнай кітайскай рэвалюцыі.

Маладыя і поўныя рэвалюцыйнай адвагі твары. Яшчэ ня так даўно яны былі поплеч з гэраічнымі пралетарамі Шанхая, Кантона, поплеч з рэвалюцыйнымі сялянамі Хубэя, Гуандуня, Ганьсу, з вінтоўкаю ў руках, здабываючы свае права на саветы. Сёньня яны тут, у СССР, удасканальваюць сваё ўменьне ўладаць другой, галоўнай зброяй — **ленінізмам.** Бо ленінізм пампожаны на кітайскі пралетарыят і яго Чырвоную армію — гэта і ёсьць пераможная рэвалюцыя Саветаў Кітая.

Делегацыя кітайскіх рэвалюцыянэраў прыехала прывітаць XIII зьезд КП(б)Б ад імя кітайскіх рабочых і сялян, што сёньня сабраліся на свой першы, але не апошні зьезд Саветаў. Менск ад Шанхая ляжыць на адлегласьці шмат тысяч кілёмэтраў. Жывое-ж інтэрнацыянальнае пачуцьцё ня ведае адлегласьцей.

* * *

— Слова для прывітаньня ад імя кіткампартыі і рэвалюцыйных мас працоўных Кітая дасьца т. **Чан Кай-фа...**

Зноў заля бушуе прыбоем рэвалюцыйных пачуцьцяў. Тав. Чан Кай-фа гаворыць на кітайскай мове. У яго голасе—і радасьць першых перамог Чырвонага Шанхая і Кантона, і моцная клясавая нянавісьць да катаў дзесяткаў тысяч мучаньнікаў кітайскай рэвалюцыі, і бадзёрая вера ў блізкі час расплаты.

Ён рэзка ўзмахвае рукой, сьціснутай у кулак. Гэта значыць—

Прэч крывавы ўрад Чан Кай-шы і Гаміндану!

Перакладчык—ён патрэбен хіба толькі для таго, каб афарыміць гукавыя ўражаньні прамовы. Сутнасьць таго, што казаў сакратар хубэйскага абкому кіткампартыі Чан Кай-фа,—дайшло на адрасе і без перакладу.

— Крывавы ўрад Чан Кай-шы ня змог выранцьць ні аднаго пытаньня, высунутага рэвалюцыяй. Бушуюць забастоўкамі і узброенымі дэманстрацыямі пралетарскія цэнтры Шанхая, Гангконга, Ханькоу. Шырокай хваляй, падобна на хвалі Янцзы ўзьнімаецца кітайскае сялянства... 75 мільёнаў галадаючых людзей... Два мільёны намерных з голаду ў Шэньсі, больш мільёну ў Суньцане, два мільёна у Ганьсу...

Весь той жудасны рахунак, які прад'яўляе кітайскае рэвалюцыйнае сялянства гаміндапаўскаму ўраду і імперыялізму. Але самае галоўнае — кітайская кампартыя з кожным месяцам становіцца прызнаным правадыром рэвалюцыі, яна загартоўваецца ў бойках, расьце, бальшавізуецца, адмятаючы здрадніка ў тыну Чэн-Ду-Сю і «левага», авантурыстскага пучызму. Яна становіцца сапраўды ленінскай гэраічнай сэкцыяй Камуністычнага Інтэрнацыянелу.

Няхай на яе шляху шмат перашкод; нахай імперыялістыя Францыі і Англіі пасылаюць крэйсэры і самалёты ў воды і паветра Кітая.

Але—жыве першы зьезд Саветаў Кітая!

І хто ведае, ці далёка той час, мы будзем вітаць другі ўсекітайскі зьезд рабочых, сялянскіх і чырвонамейскіх дэпутатаў.

* * *

Шанхайская работніца т. **Э Дзі-са** радае зьезду прывітаньне ад імя рабоніц і сялянак Кітая. Яна расказвае матычную і разам з тым прыгожановесьць аб тым, як змагаецца [illegible]веты кітайская работніца і сялянка. [illegible]лас яе часта прарываецца спалучы сьлёз і гневу. Гэта боль і нянавісьць самай прычнечанай, самай бясправнай часткі кітайскага пралетарыяту. [illegible]дзін прэды і 8-9 кітайскіх долараў [illegible]платы ўмесьці, якіх хапае для таго, каб купіць жменьку рысу. Ніякіх [illegible]каў, ніякіх адпачынкаў, нават у [illegible]джарнасьці.

У Шэньсі жанчыны і дзеці працуюць па цане ад 5 да 20 долараў...

У кітайскай работніцы ёсьць [illegible]ныя гэраічныя традыцыі. Гэта — [illegible]дыцыі сумесных з пралетарыямі [illegible] бы на барыкадах Шанхая і Кантона [illegible] дзіўна тое, што сёньня кітайская [illegible]ніца і сялянка ідзе у першых рядах рэвалюцыйнай барацьбы, прыходзіч[illegible] дапамогу атрадам Чырвонай арміі [illegible] надзвычай цяжкай барацьбе.

Тав. Э Дзі-са канчае сваю прамову бадзёрым «ура» за кітайскую работніцу і сялянку, што ідуць поплеч у рядах цыйных калёнах кітайскіх рабочых і сялян. Гэтае «ура» падхапляецца на [illegible]чу галасоў прысутных у залі.

* * *

Такім быў вечар 1

ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БУДАЎНІЧЫХ МАТАР'ЯЛАЎ ПАТРАБУЕ УВАГІ САВЕЦКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ

Усе сілы—на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну

Фарсаваць будаўніцтва новых прадпрыемстваў.—Яшчэ ў гэтым годзе яны павінны даць 32.000,000 шт. цэглы

У ДЗЕНЬ АДКРЫЦЬЦЯ XVI ЗЬЕЗДУ ЗАСНОУВАЕЦЦА ПЕРШЫ У БССР ЦЭМЭНТНЫ ЗАВОД

У БССР ёсьць вялізарныя сыр'цовыя матчымасьці для разьвіцьця прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў. Савецкая Беларусь ужо пакрылася сеткаю цагельняў, ваняных, чарапічных заводаў. Будуюцца буйныя сілікатныя і цэмэнтны заводы.

Дасягненьні ў гэтай галіне даволі значныя. Аднак, прыродныя багацьці рэспублікі далёка ня выкарыстаны.

„Разьмеры капітальных укладаў у прамысловасьць і народную гаспадарку, якія ўсё павялічваюцца з году ў год, патрабуюць ад прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў такіх тэмпаў разьвіцьця, якія-б адпавядалі патрэбнасьці ў іх з боку народнай гаспадаркі, што індустрыялізуецца. Разьмеры капітальнага будаўніцтва, якія ўсё павялічваюцца, патрабуюць таксама максымальнай мэханізацыі будаўнічых работ".

З тэзісаў тав. Куйбышава да XVI зьезду УсеКП(б)

Тэмпы будаўніцтва абганяюць вытворчасьць матар'ялаў

Прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў не пасьпявае за агульнымі тэмпамі будаўніцтва. Адной толькі цэглы ў БССР не хапае 30 мільёнаў штук. Дэфіцыт па Менску складае 11 міл. штук цэглы. Тое-ж самае з цэлым радам інш. матар'ялаў.

Што-ж робіцца для ліквідацыі гэтага дэфіцыту?

Будаб'яднаньне мае 9 цагелень, 2 ваняныя заводы і кафляна-плітачныя заводы у Копысі. Паводле прамфінпляну на 1929-30 год цагельні павінны даць да 1-га кастрычніка 57 з палов. мільёнаў штук гатовай цэглы і 76 міл. штук сырцу. На сырцы прамфінплян перавыкананы з мінулым годам павялічаны на 50 проц. на цэгле — на 100 проц.

Гэтым-жа прамфінпляном прадугледжана правядзеньне раду важных мерапрыемстваў на рацыяналізацыі і мэханізацыі працэсаў вытворчасьці — замена ручной падвозкі гліны з кар'еру вагонэткамі, падвозка гліны з шпадэраў да навесаў, устаноўка на некаторых заводах агрэгатаў, якія замяняюць гліномялкі, [illegible] фармоўку і г. д.

Ажыцьцяўленьне большасьці гэтых мерапрыемстваў фактычна правалена з прычыны невыкананьня заказаў на рэйкі, вагонэткі і агрэгаты. Зусім не атрымалі рэйкі і вагонэткі. З 8 заказаных агрэгатаў на сёньняшні дзень не атрыманы ні адзін.

У гліняку работа, на большасьці цагелень, як і раней, праводзіцца выключна ручным, прымітыўным спосабам. Гэта значна павялічыла патрэбу у рабочай сілы.

Цяжкое становішча з рабочай сілай

Становішча з рабсілай — катастрафічнае. На адных толькі трох цагельнях Менску не хапае 500 рабочых, галоўным чынам, чорнарабочых. Наогул-жа на цагельнай прамысловасьці Беларусі не хапае 30 проц. рабочых. Будаўнічыя арганізацыі ня ўжылі своячасова рацыўчых мер да падрыхтоўкі кадраў для цагельнай прамысловасьці. Толькі зараз Беларусбудаб'яднаньне заварушылася і накіравала представіцеляў у некаторыя раёны для вярбоўкі рабочай сілы.

Як-жа выконваецца прамфінпляц? Сэзон загатоўкі сырцу пачаўся яшчэ ў канцы красавіка. Мінула ўжо больш месяца. Папярэднія весткі гавораць аб сур'ёзнай пагрозе невыкананьня прамфінпляну, што ў сваю чаргу можа выклікаць спыненьне і замаруджаньне ў гэтых матар'ялаў.

Сушка цэглы на Менскім мэханізаваным цагляным заводзе

Сур'ёзнай пагрозе невыкананьня прамфінпляну, што ў сваю чаргу можа выклікаць спыненьне і замаруджаньне тэмпу работ па радзе важных аб'ектаў будаўніцтва. Замест 15 мільёнаў штук сырцу загатоўлена ня больш 10-11 міл. штук. З прычыны нястачы рабочых у Менску на некаторых цагельнях гліны мялкі не выкарыстоўваюцца.

Пад пагрозай знаходзіцца і выкананьне пляну выпуску гатовай цэглы. Да 1-га чэрвеня павінны былі быць пушчаны ўсе печы, фактычна-ж працуюць ня больш 75 проц. Будаўнічыя арганізацыі зацягнулі з рамонтам сваіх-жа 5 печаў у Менску, Магілеве, Гомелі і Віцебску, якія пацярпелі аварыю ў мінулым годзе.

Значна лепш на ваняных заводах, якія ў гэтым годзе дадуць 2.700 тон ванны.

Работа кафляна-плітачнай прамысловасьці

Кафляна-плітачныя заводы ў Копысі вядуцца ўсесаюзным настаўнічыком кафлі і плітак. Заводы экспартуюць сваю прадукцыю і за межы. Летась на заводах быў рад сур'ёзных прарываў. За першае паўгодзьдзе 1929-30 г. заводы выканалі прамфінпляц на 101-102 проц. У зьвязку з недахопам імпартнага сырцу — волава і сьвінцу — заводы 1-га красавіка сталі пад пагрозай закрыцьця. Аднак, заводы своячасова пераключыліся на другія асартымэнты прадукцыі, што дае магчымасьць у значнай ступені ўнікнуць завозу з-за межы імпартнага сырцу.

Рост вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў

У бягучым годзе **Будаб'яднаньне ўкладае ў капітальнае будаўніцтва 5.300.000 рублёў супроць 1.500.000 рублёў у мінулым годзе.** Будуецца рад новых заводаў — цагельня ў Аршанскім раёне, на 7 міл. штук, сілікатны завод у Воршы, на 12 міл. штук; чарапічныя заводы ў Віцебску і Менску, ваняныя заводы і г. д. Апрача таго, звыш пляну будуюцца ў Менску 4 цагельні, на 30 міл. шт. цэглы. Заводы павінны быць скончаны ў ліпені. Новыя цагельні ўжо сёлета павінны даць 24 міл. шт. сырцу і 8 міл. шт. гатовай цэглы. Пуск чарапічнага заводу ў Віцебску затрымліваецца заводам «Камунар», які дасюль ня выканаў заказу на трансмісію, у той час як тэрмін скончыўся 15-га красавіка.

Першы ў БССР цэмэнтны завод

Асаблівую цікавасьць прадстаўляе **цэмэнтны завод**, які будуецца ў Крычаве. Гэта першы ў БССР цэмэнтны завод. **Ён першы ў СССР будзе абсталяваны савецкімі трубапечамі.** Дагэтуль печы для цэмэнтных заводаў завозіліся з Нямеччыны і Даніі. Завод разьлічаны на 700 тыс. бочак цэмэнту ў год. Кошт будаўніцтва каля 7 міл. руб. На бягучы сэзон адпушчана каля 2 міл. рублёў. Аднак, гэтых сродкаў ня хопіць.

На тэрыторыі заводу ўжо разгарнулася падрыхтоўчая работа. Набудаваны лябараторыя, кантора, матар'яльны склад, склад для алівы. Будуюцца мэханічная майстэрня, стайня і г. д. Сёлета мяркуецца скончыць асноўныя работы з тым, каб пусьціць завод поўнасьцю 1-га красавіка 1931 году. На будаўніцтве занята каля 400 чалавек. Лік рабочых павялічыцца да 1.000.

Вакол заводу будуецца першы на Беларусі сацыялістычны гарадок з інтэрнатамі, клюбам, станоўкай, кааператывам, бальніцай, школай і г. д. Завод зусім зьменіць аблічча старога мястэчка Крычава. Пры заводзе будуецца спэцыяльная электрастанцыя на 2.500 кілёват, якая будзе абслугоўваць і бліжэйшыя калгасы. **Урачыстая закладка галоўных карпусоў заводу адбудзецца ў дзень адкрыцьця XVI зьезду УсеКП(б).** Трэба адзначыць, што будаўніцтва адчувае моцную нястачу ў інжынэрна-тэхнічным персанале. Будаўніцтвам кіруе адзін малады інжынэр, ут ой чаго як патрэбны ня менш 2-3. Тое-ж самае з тэхнікамі.

Якія пэрспэктывы на 1930-31 год?

Вялдзяржбудаб'яднаньне вызначыла пабудову ў розных раёнах БССР 37 новых цагельняў, сілікатных, клінкорных і інш. заводаў. **На гэтую мэту патрэбны 25 міл. рублёў, у 5 раз больш, чым сёлета.** Такія віды прадукцыі як аснятрывалая і аблiцовачная цэгла, каналізацыйныя трубы, толь і інш. будуць вырабляцца у БССР упершыню. Да пабудовы гэтых заводаў мяркуецца прыступіць ужо ў кастрычніку з такім разьлікам, каб цагельні былі пушчаны з 1-га ліпеня 1931 году.

Некаторыя дапаможныя работы пачнуцца ўжо ў гэтым сэзоне. Будаб'яднаньне хадайнічае перад ВСНГ аб водпуску ў лік будучых асыгнаваньняў 800.000 рублёў.

Аднак, тут ёсьць сур'ёзная небясьпека. Горная група ВСНГ вельмі марудзіць з правядзеньнем дасьледных работ і адшуканьнем сыр'цовых баз для новых заводаў.

Прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў патрабуе большае ўвагі з боку ўсіх савецкіх, партыйных і прафэсіянальных арганізацый.

М. КІН.



Мэханічная падача сырцу

Мэханічная рэзка цэглы

ОРДЭН ЧЫРВОНАГА ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ—ШВЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ „КАСТРЫЧНІК"

Учора ЦП сюзу швэйнікаў і Белшвэйаб'яднаньне паслалі ліст ЦСПСБ і прэзыдыуму ВСНГ наступнага зьместу:

«На фронце сацыялістычнага будаўніцтва беларускай дзяржаўнай прамысловасьці ФАБРЫКА «КАСТРЫЧНІК» мае вялікія заслугі, якія дасягнуты выключна дзякуючы вялізарнаму росту энтузіязму, сьвядомасьці і рэвалюцыйнага парыву рабочай масы, якая працуе над выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва праходзілі на фабрыцы з асаблівым уздымам і актыўнасьцю, асабліва старой групы рабочых, якая сваёй працай і ініцыятывай дабілася разьвіцьця фабрыкі з дробнай майстэрні ў гігант з лікам 1.500 рабочых.

Рабочы калектыў праявіў асаблівы энтузіязм у справе выкананьня вытворчай праграмы, узьняцьця прадукцыйнасьці працы, палапшэньня якасьці прадукцыі, узмацненьня працдысцыпліны, зьніжэньня сабекошту і г. д.

Усё гэта разам узятае СТАВІЦЬ ФАБРЫКУ «КАСТРЫЧНІК» У ПАРАЎНАНЬНІ З ІНШЫМІ ДЗЯРЖАЎНЫМІ ШВЭЙНЫМІ ФАБРЫКАМІ НА ПЕРШАЕ МЕСЦА.

На падставе гэтага Белшвэйаб'яднаньне і ЦП саюзу швэйнікаў просяць прэзыдыум ВСНГ і ЦСПСБ УЗЬНЯЦЬ ХАДАЙНІЦТВА ПЕРАД ЦВК БССР АБ УЗНАГАРОДЗЕ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК» ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ, А АСОБНЫХ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ АСАБЛІВА ДОБРА СЯБЕ ПАКАЗАЛІ, ПРАДСТАВІЦЬ ДЛЯ ІНШЫХ УЗНАГАРОД. Перадача ордэну Чырвонага працоўнага сьцягу пажадана прыстасаваць ДА ДНЯ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ — 11-га ЛІПЕНЯ Г.Г.».

Ліст падпісаны старшынёй ЦП саюзу швэйнікаў т. МАЙЗЭЛЕМ і кіраўніком Белшвэйаб'яднаньня т. БАСКІНЫМ.

Партыйным зьездам

Фанэрны цэх выканаў сваё абяцаньне XIII партзьезду

Вытворчая праграма за май перавыкананая

Рабочыя фанэрнага цэху Бабруйскага камбінату выканалі сваё абяцаньне, якое яны далі XIII зьезду КП(б)Б.

Вытворчая праграма за май выканана з перавышэньнем на 9,3 проц. Заданьне па выпуску экспартнай прадукцыі выканана поўнасьцю, з некаторым перавышэньнем.

Папярэдзім прарыў

Прагуў гудок і рабочыя першай зьмены фанэрнага цэху Бабруйскага камбінату пайшлі ў чырвоны куток на лятучы мітынг.

Інфармацыя загадчыка цэхам т. ГУЛЕВА кароткая.

— У выніку злачынкай нядбайнасьці працаўнікоў біржы піламатар'ялаў цэх апынуўся бяз сырцу. Калі рабочыя першай зьмены ня пойдуць добраахвотна на некалькі гадзін рэзаць чуракі, дык можа стаць трэцяя зьмена, бо для яе ня хопіць сырцу.

Блытаныя тлумачэньні загадчыка біржы ПАСТАРНАКА, звальваньне віны на «аб'ектыўныя прычыны», нікога не задавальняюць. Адзін за другім выступаюць рабочыя. Яны патрабуюць тэрміновага расьсьледваньня прычыны нястачы сырцу. Адначасова рабочыя ў адзін голас заяўляюць:

— Мы абяцалі ліквідаваць прарыў да партыйных зьездаў. Мы ні ў якім разе ня можам дапусьціць прастою нават адной зьмены. Хоць мы прапрацавалі 8 гадзін, але УСЕ ПОЙДЗЕМ ДАДАТКОВА ПРАЦАВАЦЬ, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЦЭХ СЫРЦОМ.

Вылучыўшы камісію для расьсьледваньня прычын нястачы сырцу, рабочыя першай зьмены бадзёра пайшлі рэзаць чуракі.

Рабочыя фанэрнага цэху паказалі яшчэ раз сваю высокую сьвядомасьць, сваё цьвёрдае імкненьне ліквідаваць прарывы да партыйных зьездаў. Гэта было 1 чэрвеня 1930 г.

А. МАГІДАЎ.

Ударныя брыгады імя XVI-га партзьезду

УЛІЧВАЮЧЫ ВЯЛІЗАРНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ І ВУРНЫЯ ТЭМПЫ НАШАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ УсеКП(б), МЫ, БРЫГАДА МАНЦЭРАЎ ВІЦЕВСКАГА ЗАВОДУ **«ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ»**, У ЛІКУ 11 ЧАЛ., АВЯЗЫЧАЕМ СЯБЕ ЎДАРНАЙ БРЫГАДАЙ ІМЯ XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б).

БЯРЭМ НА СЯБЕ НАСТУПНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ДЛЯ ХУТЧЭЙШАГА ВЫКАНАНЬНЯ НАШАГА ПРАМФІНПЛЯНУ: 1) УВАЖНА І ЭКАНОМНА СКАРЫСТОЎВАЦЬ МАТАР'ЯЛЫ; 2) УЗЬНЯЦЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ, ЗНІЖЭЎШЫ ПРОЦАНТ ПРАСТОЮ МАТОРАЎ ДА НУЛЯ; 3) ШТОДЗЕННА АКУРАТНА ПЕРАГЛЯДАЦЬ МАТОРЫ І ВЫПРАЎЛЯЦЬ ВЫЯЎЛЕНЫЯ НЕДАХОПЫ.

АДНАЧАСОВА ПАТРАБУЕМ АД РАБОЧЫХ ЗАВОДУ ЎВАЖНЫХ І АКУРАТНЫХ АДНОСІН ДА ВАРШТАТАЎ І ЭЛЕКТРА - АБСТАЛЯВАНЬНЯ. У СВАЮ ЧАРГУ ВЫКЛІКАЕМ НА СПАБОРНІЦТВА БРЫГАДУ РАМОНТНЫХ СЬЛЕСАРОЎ МЭХАНІЧНАГА ЦЭХУ І БРЫГАДУ, ЯКАЯ АБСЛУГОЎВАЕ СІЛАВУЮ СТАНЦІЮ.

УДАРНАЯ БРЫГАДА РАМОНТНЫХ МАНЦЭРАЎ **ІМЯ XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б).**

ПАВЯЛІЧВАЮЦЬ НОРМЫ

Камсамольская брыгада па зборцы плугоў заводу «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ», у колькасьці 6 чал., абвяшчае сябе ўдарнай імя XIII зьезду КП(б)Б і ў парадку сацспаборніцтва бярэ на сябе абавязацельства—замест штодзённай зборкі 170-180 плугоў зьбіраць па 240 у дзень.

Адначасова выклікае на спаборніцтва першую брыгаду па зборцы плугоў плужнага цэху.

Трайчанскі, Шаціхін, Яшкін, Кроценка, Кудраўцаў і Кожамячанка.

* * *

Мы, рабочыя па набіўцы сіт заводу «Чырвоны Мэталісты»—абвяшчаем сябе ўдарнікамі імя XVI зьезду УсеКП(б) і бярэм на сябе абавязацельства ўзьняць прадукцыйнасьць працы на разрэзцы сіт на 5 проц. і выклікаем у сваю чаргу брыгаду на зборцы арфаў.

Сокалаў, Брыскер, Немчынка.

* * *

Мы, рабочыя ўпаковачнага цэху ф-кі «Дзьвіна», бярэм на сябе абавязацельства замест 50 пудоў пражы ў дзень упакоўваць па 60 пудоў і выклікаем на спаборніцтва іншыя цэхі.

Група ўпакоўшчыкаў цэху.

* * *

Мы, рабочыя пыльнага ваўчка, ф-кі «Дзьвіна», абвяшчаем сябе ўдарнымі і абавязуемся выконваць **удвух** усю тую работу, якую да гэтага часу мы выконвалі **ўчатырох**, і яшчэ бярэм на сябе абавязацельства спяшаць і адзяваць рамянны пыльнага ваўчка пры ўмове, каб нам выдалі замок і два ключы для шафы з інструментамі.

Н. Гэроцкі і І. Суворaў.

ПЕРАКЛІЧКА РАЗГОРТВАЕЦЦА

Рабочыя камбінаванай фабрыкі ў Бабруйску на сваім сходзе аднадушна прынялі выклік швэйнай фабрыкі, камбінату і чыгуна-ліцейнага заводу аб уступленьні ў сацыялістычную пераклічку па ліквідацыі прарываў **да XVI партзьезду**. Рабочыя абавязаліся ліквідаваць прагулы і прастоі і давесьці брак да мінімуму.

Сход заявіў, што апрача 14 ударнікаў, якія рэкамэндаваны ў партыю, рабочыя фабрыкі і ў далейшым будуць рэкамэндаваць у партыю лепшых ударнікаў. Рабочыя зьвярнуліся да рабочых чыгуна-ліцейнага заводу з просьбай узмацніць забесьпячэньне фабрыкі ліцьцём.

А. МАГІДАЎ.

Засталося 10 рашаючых дзён

АСНОЎНУЮ ЎВАГУ АДДАЦЬ ПОЎНАМУ ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНУ ТЭХКУЛЬТУР

Яшчэ многа можна зрабіць у галіне сяўбы кукурузы і сланэчніку

Толькі 8 проц. пляну

Сяўба сіласных культур (кукурузы і сланэчніка) у БССР фактычна правалена.

Пасэўным плянам былі запраектаваны зусім скромныя мінімальныя лічбы: 5.500 гэкт. для калгасаў і індывідуальнага сэктару і 300 гэкт. для саўгасаў БССР. Пры належнай увазе і зацікаўленасьці з боку мясцовых арганізацый, гэтыя лічбы маглі быць поўнасьцю выкананы і нават перавышаны. А што мы маем па справе?

На 25-га мая плян сяўбы на сіласных культурах выкананы толькі... на 8,5% Усяго засеяна калгасамі і індывідуальным сэктарам 471 гэкт., прычым пад слапэчнік засеяна... 25 гэктараў.

Гомельская акруга засеяла пад сіласныя культуры 75 гэкт. замест 600 гэкт. (12,5 проц.), Мазырская—96 гэкт. замест 400 (24 проц.), Аршанская—8 гэкт. замест 600 (1,3 проц.), Віцебская—37 гэкт. замест 400 (9,2 проц.), Бабруйская—201 гэкт. замест 900 (22,3 проц.), Полацкая—15 гэкт. замест 400 (3,7 проц.), Менская — 35 гэкт. замест 500 (7,4 проц.). Магілеўская, наводле пляну павінна была засеяць над сіласныя культуры 2.000 гэкт. Няма ніякага сумненьня, што і тут становішча ня лепшае, чым у іншых округах. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што Магілеўскі акрэз, ня гледзячы на папамінаньні Наркамзему БССР упарта не дасылае вестак аб ходзе сяўбы сіласных культур.

Паданыя лічбы са ўсёй яснасьцю пацьвярджаюць правільнасьць неаднаразовых сыгналаў «Зьвязды» аб зрыве пасэўнага пляну па сіласных культурах. Мясцовыя зямельныя арганізацыі ўвесь час злачынна ігнаруюць сяўбу гэтых культур, ня гледзячы на зусім выразныя дырэктывы партыі і ўраду. Яны ня ўжывалі ніякіх мер для папулярызацыі сіласных культур сярод калгасаў і індывідуальных гаспадарак.

Зрыў сяўбы сіласных культур бясспрэчна ставіць над сур'ёзную пагрозу і плян сіласаваньня—гэтага асноўнага мерапрыемства па стварэньні кармовай базы для разьвіцьця жывёлагадоўлі ў БССР.

Да канца сяўбы засталося яшчэ ня больш 8-10 дзён. Гэты тэрмін можна і трэба выкарыстаць для фарсаваньня сяўбы сіласных культур. **Галкін.**

Самахвалавіцкі і Глускі раёны скончылі сяўбу

Па тэхкультурах заданьне Самахвалавічамі ня выканана

САМАХВАЛАВІЧЫ, Менскай акругі. У раёне скончана сяўба. Па 42 калгасах засеяна 3.950 гэкт. аўсу, у тым ліку чыста гатунковым 1.600 гэкт., 1.040 гэкт. ячменю, у тым ліку 260 гэкт. чыста гатунковага.

Плянавае заданьне па збожжавых культурах, канюшыне, бульбе выкананa поўнасьцю. Скарочан плян сяўбы пасеннай вікі, вікі па корм, а таксама лубіну па ўгнаеньне—за адсутнасьцю пасеньня.

На тэхкультурах пасеўны плян ня выкананы. Калгасы пасеялі лён толькі для сваіх уласных патрэб. Мэліярацыйныя таварыствы не засеялі ўсёй колькасьці капапель з прычыны адсутнасьці калійных угнаеньняў.

* * *

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Глускі раён скончыў сяўбу. Калгасы выканалі свой пасеўны плян на 101 проц.

БАРАЦЬБА СА ШКОДНІКАМІ—БЯСПРЫТУЛЬНАЯ СПРАВА

Справа барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі ў БССР фактычна нікога ня цікавіць. Гэта тым больш не дапушчальна, калі прыняць пад увагу пагрозу зьяўленьня на нашых палёх лугавога матылька, які можа прынесьці вялізарныя страты сельскай гаспадарцы.

Ужо каля трох месяцаў як у Наркамземе БССР няма нават спэцыялістага, які-б кіраваў гэтай справай і арганізаваў барацьбу са шкоднікамі. Абавязкі такога спэцыялістага былі часова ўскладзены на другога працаўніка. Зараз-жа і часова выконваючы абавязкі спэцыялістага па барацьбе са шкоднікамі вызвалены ад гэтай працы.

У выніку — з боку Наркамзему няма поўных установак у галіне арганізацыі барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі. Наркамзем да гэтага часу нічога не зрабіў, каб, як належыць, падрыхтаваць зацікаўленыя ўстановы да барацьбы са шкоднікамі. Ім яшчэ ня выпрацаваны аднаведныя мэтады барацьбы, якія падыходзяць да нашых умоў.

У сыстэмах сельска-гаспадарчай кааперацыі (Белпаляводсаюз, Белсадсаюз), Белсельтрэсьце, ільна-канапляным аб'яднаньні таксама няма спэцыяльных людзей, якія-б займаліся арганізацыяй барацьбы са шкоднікамі. Гэту работу выконваюць аграномы, не спэцыялізаваныя ў даным пытаньні, у парадку нагрузкі да іншых сваіх абавязкаў. Праўда, зусім не абавязкова мець у кожнай арганізацыі спэцыялістага па барацьбе са шкоднікамі. Але неабходна, каб і яна вялася па адзіным пляне ўсімі сэктарамі і сыстэмамі, па адзіным мэтадзе. Гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі справай барацьбы са шкоднікамі будзе кіраваць Наркамзем, калі ў Наркамземе будзе кваліфікаваны спэцыяліст ў гэтым пытаньні.

С.

Садзяць бульбу ў камуне «Луч сацыялізму», Самахвалавіцкага р-ну.

Перавыбары ФЗМК ператворым у масавую кампанію перабудовы прафработы

«ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу ўсіх партарганізацый на тое, што перавыбары ФЗМК павінны прайсьці, як баявая палітычная кампанія вялікай важнасьці, якая павінна на бліжэйшы час стаць у цэнтры ўвагі ўсіх партарганізацый, асабліва на прадпрыемствах і да якое неабходна прыцягнуць самыя шырокія масы рабочых і членаў прафсаюзаў. (З лісту ЦК КП(б)Б аб перавыбарах ФЗМК).

Перавыбары ФЗМК у гэтым годзе праходзяць, як масавая баявая палітычная кампанія. Асноўнымі лёзунгамі перавыбараў зьяўляюцца — барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, мабілізацыя энтузіязму рабочых мас на хутчэйшую ліквідацыю прарываў, перабудова работы прафсаюзаў з мэтаю гледжаньня поўнага павароту іх тварам да вытворчасьці.

Кампанія перавыбараў ФЗМК павінна асабліва мабілізаваць увагу рабочых мас на выкананьне пастаўленай IV-м пленумам УсеЦСПС задачы — выканаць у другім паўгодзьдзі колькасныя і якасныя наказальнікі прамфінпляну, ня толькі запраектаваныя на другое паўгодзьдзе, але і недавыкананыя ў першым паўгодзьдзі.

Апошка пасьпяховасьці кампаніі будзе лежа на падставе таго, наколькі парэвыбары і прафсаюзныя арганізацыі здолеюць мабілізаваць увагу шырокіх мас рабочых на выкананьне вышэйпаказаных задач.

Сёньня мы ня можам адзначыць, што партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі ўзялі ўдарныя тэмпы правядзеньні кампаніі перавыбараў ФЗМК. Друк яшчэ вельмі слаба разгушуецца. Толькі «Віцебскі Пралетарый» 15-га мая даў перадавы артыкул аб перавыбарах і на гэтым супакоіўся. А між іншым нам вядома, што перавыбары ЦК саюзу мэталістых на Віцебшчыне не мабілізавалі ўвагі ўсіх прафарганізацый з тым, каб практыка мэталістых была поўнасьцю выкарыстана іншымі саюзамі. Цэнтральны друк таксама яшчэ мала зрабіў. І гэта ў той час, як увесь друк, а асабліва заводзкі, паграе адпраўць вялікую ролю ў правядзеньні перавыбараў.

Вялікае значэньне для пасьпяховага правядзеньня перавыбараў мае своячасовая масавая падрыхтоўка. Трэба справу падрыхтоўкі арганізаваць так, каб сама маса рабочых у парадку добраахвотнасьці, на падставе разгорнутай самакрытыкі, праверыла ўсе галіны работы ФЗМК і выявіла, наколькі ФЗМК у цэлым, а ня толькі выбраленыя работнікі, вялі барацьбу за выкананьне прамфінпляну, як ФЗМК кіравалі сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, як у штодзённай рабоце клапаціліся аб паляпшэньні матар'яльна - бытавога становішча рабочых і як ФЗМК змагаліся за паляпшэньне становішча аховы працы на прадпрыемствах.

Кампанія перавыбараў ФЗМК павінна вызваліць ФЗМК ад тых работнікаў, якія пятнуцца ў хвасьце рабочых мас, якія ня здольны стаць на чале творчага энтузіязму рабочых і ўдарніцкага руху.

У складзе нанава выбраных ФЗМК ня можа быць членаў ФЗМК ня ўдарнікаў. Толькі сапраўдныя ўдарнікі здольны паўдарнаму хутка перабудаваць работу прафсаюзаў — тварам да вытворчасьці.

Асобна трэба спыніцца на ўцягненьні ў склад ФЗМК моладзі і работніц. Зараз у складзе ФЗМК вельмі мала ёсьць работніц і асабліва моладзі. Трэба больш смела высоўваць моладзь і работніц на практычную работу прафсаюзаў.

Перавыбары ФЗМК саюзу мэталістых і рабочых паняровай вытворчасьці паказалі ў цэлым радзе месц слабую актыўнасьць партыйцаў і камсамольцаў. Нават былі выпадкі, калі партыйцы і камсамольцы не зьяўляліся на агульныя сходы, прысьвечаныя перавыбарам. Трэба неадкладна ажыць гэтыя адмоўныя зьявішчы.

Перавыбары ФЗМК праходзяць у перыяд XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), у парадку дня якіх стаіць пытаньне — «задачы прафсаюзаў у рэканструкцыйны перыяд». Трэба, каб кампанія перавыбараў ФЗМК мабілізавала ўвагу шырокіх мас рабочых на хуткае правядзеньне ў жыцьцё пастаноў зьезду і была ператворана ў масавую кампанію перабудовы работы прафсаюзаў.

С. ВАШКЕВІЧ.

Да XVI-га зьезду УсеКП(б)—плян да варштату

Слова за інжынэрамі і тэхнікамі

(Артыкул старшыні БелМБІТ тав. Каплана)

Даныя аб выкананьні прамфінпляну за першыя 7 месяцаў бягучага году паказваюць, што прамфінпляц далёка яшчэ ня выкананы. Ня гледзячы на вялікія дасягненьні, ёсьць прарывы ня толькі ў якасных паказальніках, але і ў колькасных. Па валовой прадукцыі праграма за 7 месяцаў не выкананa на 4.8 проц., прадукцыйнасьць працы павялічылася на 32 проц. замест пляновых 35 проц. Значна горш абстаіць справа са зьніжэньнем сабекошту, якое складае па рэспубліканскай прамысловасьці за 1-е паўгодзьдзе ўсяго 7 проц. замест пляновых 11 проц. Яшчэ горшая справа з якасьцю прадукцыі. А між тым зараз для ўсіх стала зусім ясна, што прамфінпляц рэальны і можа быць выкананы ў многіх выпадках нават перавыкананы.

Прычыны прарываў амаль усюды ляжаць галоўным чынам у арганізацыйных недахопах. Сюды трэба аднесьці тую акалічнасьць, што да гэтага часу на многіх заводах і фабрыках прамфінпляц не даведзен да цэху і варштату. Асноўны рухавік паных дасягненьняў у галіне гаспадарчага будаўніцтва—энтузіязм рабочых мас, які знаходзіў свой адбітак ва ўдарніцтве і сацспаборніцтве.

Але гэты **энтузіязм можа быць поўнасьцю рэалізаваны, калі ён будзе накіраван на зусім канкрэтныя задачы, на пэўныя, выразна сфармуляваныя заданьні. Гэта зусім магчыма для ажыцьцяўленьня пры давядзеньні прамфінпляну да кожнага варштату, да кожнага рабочага месца.**

Налёт на прадпрыемствы, які быў праведзен гэтымі днямі, выявіў, што гэта работа яшчэ не прароблена па многіх прадпрыемствах і, у прыватнасьці, па некаторых мэталяапрацоўчых заводах, што відаць са зьмешчаных у «Зьвязьдзе» матар'ялаў. Мы лічым, што пытаньне аб тым, хто павінен выконваць гэту работу, ня можа мець месца. У першую чаргу **адміністрацыя заводу** павінна паклапаціцца аб тым, каб рабочыя ня толькі былі знаёмы з прамфінпляцам, але каб кожны ведаў дасканала сваю ролю і што яму трэба рабіць. **Прафсаюзныя арганізацыі** са свайго боку павінны прыйсьці на дапамогу і тут **асабліва вялікая роля інжынэрна-тэхнічных сэкцый і асобных тэхнікаў, якія па сваім становішчы на заводзе павінны прыняць актыўны ўдзел у распрацоўцы прамфінпляну.**

Давесьці плян да варштату параўнаўча лёгка там, дзе ёсьць масавая работа, настаянны заказ, дзе на варштаце штодня робіцца адна і тая-ж работа. Некалькі цяжэй гэта зрабіць ва ўмовах, дзе работа мяняецца большменш часта. Тут відавочна неабходна, каб адміністрацыя і тэхнічны пэрсанал пэрыядычна, скажам, кожны месяц, або кожныя 10 дзён, а пры неабходнасьці і часьцей, раней тэрміну складалі пляны работ для асобных варштатаў або рабочых мес.

Тэхніка выкананьня гэтай задачы, зразумела, ня можа быць аднолькавай для ўсіх вытворчасьцей і павінна быць прапрацавана асобна адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам аднаведных прадпрыемстваў разам з прафсаюзнымі арганізацыямі. Для ўсіх знаёмых з работай заводу павінна быць ясна, што **адзін факт папярэдняга разьмеркаваньня работ паміж асобнымі варштатамі ўжо павінен даць шмат у сэнсе лепшага скарыстаньня абсталяваньня і рабочай сілы.**

Прамфінпляц павінен быць даведзен да варштату і неадкладна. Папярэдні тэрмін, які быў дан для гэтай работы—**першага чэрвеня—ужо прайшоў. Неабходна зараз выканаць гэту работу абавязкова да 16 зьезду УсеКП(б), да якога засталося менш за два тыдні. Але тэрмін выстарчальны для пасьпяховага правядзеньня гэтай работы. Мы заклікаем усіх інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў дружна ўзяцца за гэту справу. ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫЯ СЭКЦЫІ ПАВІННЫ НЕАДКЛАДНА НАКІРАВАЦЬ УВЕСЬ СВОЙ АКТЫЎ У НАЙБОЛЬШ СЛАБЫЯ МЕСЦЫ.**

Задача павінна быць выканана, і мы спадзяемся, што інжынэрна-тэхнічныя работнікі прыложаць усе свае сілы, каб гэту задачу выканаць з найбольшым посьпехам.

У БССР можна шырока разьвіць шаўкоўніцтва

Навукова - дасьледчы інстытут прамысловасьці БССР уключыў у плян сваёй дзейнасьці пытаньне аб разьвіцьці ў БССР шаўкоўніцтва.

Гэта работа ставіць сваёй мэтай, напершае, даць дапаможныя заняткі насельніцтву, аб'яднаному ў калгасы і, на-другое, даць новы від сырцу для нашай прамысловасьці і экспарту. Пытаньне аб шаўкоўніцтве ў БССР ужо вышла з межаў тэарэтычных разважаньняў, вышла са стадыі досьледу і патрабуе да сябе сур'ёзнае грамадзкае ўвагі.

Паводле сваіх прыродных і бытавых умоў, БССР зьяўляецца краінай, у якой ёсьць усе кайкрэтныя магчымасьці для разьвядзеньня шоўку.

Так, у 1928-29 годзе праводзіліся выкармкі шаўкавічных чарвей, якія далі за два гады каля 3-х пудоў кокану. Размнажэньнем коканаў у Менску займаліся студэнты - краязнаўцы. З Менску выкармка шаўкавічных чарвей перакінулася і ў некаторыя раёны БССР: Аяраны, Тураўскага раёну (Мазыршчына), Шарсьцяны і Баркаў (Гомельшчына). Сялянства гэтых вёсак на практыцы ўбачыла, як «чэрві робяць шоўк». Глядзець на гэтае «дзіва» прыходзіла і шмат сялян з наўкольных вёсак. Усяго наведала пункты выкармак шаўкавічных чарвей каля 1.000 чал.

Досьледам разьвядзеньня шоўку займаецца і НДІ прамысловасьці пры СНК БССР. На дасьледчым полі ў Міхановічах інстытутам ужо зроблена насадка шаўкавіцы на плошчы каля 3 гэкт. Апрача таго, будзе рабіцца выкармка шаўкавікоў у Міхановічах, дзе сяляне атрымаюць практычныя парады, як займацца на сваёй гаспадарцы шаўкоўніцтвам.

Паказальная прапаганда зьявіцца найлепшым спосабам шырокай папуляризацыі шаўкоўніцтва сярод сялянства. Шаўкоўніцтва можа набыць прамысловае значэньне тады, калі яно будзе мець масавы характар.

Асноўным стымулам для разьвядзеньня шаўкавічных чарвей зьяўляецца выкармка апошніх лісьцем шаўкавічнага дрэва. Вось чаму чарговай задачай, без вырашэньня якое нельга займацца шаўкоўніцтвам, зьяўляецца масавае разьвядзеньне ў нас у БССР шаўкавічнага дрэва.

Магчымасьці-ж для росту такіх дрэў у нас ёсьць. Нашы кліматычныя ўмовы гэтаму ніколькі не перашкаджаюць. Так, да апошняга часу ў БССР налічваецца каля 1.000 шаўкавічных дрэў. Ёсьць ужо гадавальнікі і насадкі такіх дрэў у Менску і ў некаторых раёнах, але ўсе гэтае колькасьці дрэў вельмі мала для пасьпяховага разгортваньня шаўкоўніцтва. Трэба зараз-жа распачаць масавыя матачныя пасевы шаўкавіцы.

Тэкстыльсьндыкат дае матар'яльнае падтрыманьне ўсім новым раёнам, дзе ёсьць магчымасьць займацца шаўкоўніцтвам. Сродкі на разьвіцьцё шаўкоўніцтва вызначаны і для БССР.

Зараз ужо мяркуецца засеяць шаўкавіцаю ў калгасах каля 300 гэкт. Трэба таксама на надыходзячай усебеларускай выстаўцы с.-г. і прамысловасьці арганізаваць паказальную выкармку шаўкавічных чарвей.

Зразумела, што праблема шаўкоўніцтва ў БССР атрымае сваё практычнае вырашэньне толькі тады, калі гэтым пытаньнем будзе займацца спэцыяльная арганізацыя. Нам трэба ў бліжэйшы час пабудаваць у БССР спэцыяльную цэнтральную шаўкаводную станцыю, якая павінна займацца практычнай работай па шаўкоўніцтве, вывучаць больш спрыяючыя для разьвядзеньня шоўку раёны БССР і наогул весьці ўсю навукова - дасьледчую работу па шаўкоўніцтве.

М. А. ЗЬБІТКОЎСКІ.

Бальшавіцкімі тэмпамі зьнішчым прарывы на фронце падрыхтоўкі кадраў

Справа падрыхтоўкі кадраў у пэрыяд шырокага размаху сацыялістычнага будаўніцтва набывае вялікае значэньне. Тав. Сталін у сваім артыкуле «Год вялікага пералому» адзначыў: «Праблема кадраў зьяўляецца зараз, у пэрыяд тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасьці, галаўнай праблемай сацыялістычнага будаўніцтва».

Цэлы рад арганізаваных курсаў па падрыхтоўцы ў навучальных установах зьяўляюцца дапаможнікамі ў выкананьні дырэктыў партыі ў сэнсе вырашэньня праблемы кадраў. Ад работы курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ і ў тэхнікумы ў значнай меры і залежыць выкананьне дырэктыў партыі.

З атрыманых рэдакцыяй допісаў відаць, што цэлы рад арганізаваных курсаў — над нагрозай зрыву. Так, напрыклад, курсы пры Аршанскай 9-цігодным пэдтэхнікуме знаходзяцца пад нагрозай зрыву; на Менскіх курсах пры БДУ засталося 50 проц. паступіўшых. Такое самае становішча назіраецца і з Бабруйскімі курсамі. З прычыны адсутнасьці памяшканьня, Бабруйскія курсанты прымушаны весьці вандроўны спосаб жыцьця. Некаторая частка курсантаў пакінула навучаньне, а некаторыя з тых, што засталіся, яшчэ да гэтага часу ня маюць кватэр. Прычыны распаду курсаў наступныя:

1) Надбайная адносіны як партыйных, так і прафарганізацый прадпрыемстваў, якія накіроўваюць рабочых на курсы, не стварыўшы папярэдных умоў для работы.

2) Надзвычай вялізарная перагрузка слухачоў грамадзкай работай.

3) 2-х і 3-хзьменныя працы на вытворчасьці.

4) Перакідваньне курсантаў на працу, ды толькі з аднаго прадпрыемства на другое, а нават і ў другія раёны.

5) Дрэнная матар'яльнае забесьпячэньне курсантаў.

Калі загадчык курсаў пры БДУ тав. Цуцко зьвярнуўся з заявай у сэктар кадраў пры ЦПСБ, каб вызвалілі курсантаў ад грамадзкай работы, дык сэктар кадраў адказаў: «гэта пытаньне павінна яшчэ вырашыцца і наогул такая пастаноўка «дзяляцкая»(?) Адгэтуль відаць, што культсэктар і сэктар кадраў ЦСПСБ ня толькі не дапамагалі ў рабоце курсаў, але ў некаторай ступені тармазілі работу. ВСНГБ згадзіўся з пастановай ЦСПСБ аб вызваленьні курсантаў-рабочых на 2 гадзіны ад працы і ад другіх і трэціх зьмен. На вялікі жаль, ВСНГ і ЦСПСБ далей пастановы не пайшлі. Адміністрацыя прадпрыемстваў (друкарня БДВ і АДПУ, Бабрыкамб.) гэтай пастановы ня выконваюць, а ЦСПСБ не рэагавала на гэтае зьявішча. Рабочыя, пазбаўленыя магчымасьці карыстацца гэтай пастановай, прымушаны былі пакідаць курсы (БДУ).

Ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы кадраў трэба адзначыць невыстарчальную работу на лініі НКА. Узяць хаця-б такое пытаньне, як своячасовае рэагаваньне на зьменшаньня артыкулы ў газэце «Зьвязда».

Большасьць артыкулаў ня чыталіся працаўнікамі НКА, дзякуючы чаму ніякіх мер па зьнішчэньні недахопаў ня прынята. Адсутнічае сталы ўлік курсаў па БССР. Усё гэта выклікала падзвычай слабое кіраўніцтва з боку НКА. Рад пытаньняў у справе падрыхтоўкі кадраў не распрацаваны. Так, напрыклад, яшчэ да гэтага часу адсутнічаюць палажэньні, як быць з размеркаваньнем скончыўшых курсы, адсутнічае праект забраніраваньня месц для курсантаў. Такая маруднасьць у рабоце НКА пры такіх умовах выразна сьведчыць, што праблема кадраў НКА не вырашалася згодна з дырэктывамі партыі.

Усе прыведзеныя факты гаворяць, што на гэтым важнейшым вучастку яшчэ патрэбна прыкласьці многа сіл, каб дабіцца сапраўднага пералому, і рашаючым на гэтым фронце можа быць толькі настойлівае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі ў галіне праблемы падрыхтоўкі кадраў.

Ляўковіч.

Дрэнна паступаюць узносы па 3-й пазыцы на вёсцы

Паступленьні чарговых узносаў па электрыфікацыі надпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі па Менскай акрузе за апошні час значна зьменшыліся. Асабліва дрэнная справа на вёсцы. Раённыя кантрагенты і райвыканкомы вельмі мала ўвагі аддаюць своячасоваму і поўнаму спагнаньню ўзносаў па надпісцы.

На 1-га мая недапаступіла ўзносу ад рабочых—6,97 проц., па сялянскай надпісцы—50,27 проц.

У Бягомльскім раёне не паступіла па сялянскай надпісцы 76,16 проц. узносаў, у Барысаўскім раёне—73,57 проц. Між тым тэрмін сялянскай надпіскі скончыўся яшчэ 1-га лютага г. г.

Раённыя кантрагенты, савецкія і грамадзкія арганізацыі вёскі павінны прыняць усе меры, каб ліквідаваць запазычанасьць на надпісцы на 3-ю пазыку. Ліквідацыя запазычанасьці значна дапаможа выкананьню нашых бюджэтных плянаў.

МЕНСК

ПРАЕЗД НЯМЕЦКІХ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

Ноччу на 1-га чэрвеня праз Менск праехала нямецкая каманда рабочых-фізкультурнікаў у складзе 20 чалавек.

На вагзале гасьцей сустракалі менскія фізкультурнікі. Ад ЦК ЛКСМБ і ВСФКБ каманду вітаў тав. ТРАСКОЎСКІ. З адказам ад фізкультурнікаў. Нямеччыны выступіў т. ХУРЦІК.

У той-жа вечар частка каманды накіравалася ў Кіеў, другая частка ўчора раніцай выехала ў Растоў.

ФІНІШ УСЕБЕЛАРУСКАГА ВЭЛЁПРАБЕГУ

1-га чэрвеня на Пляцы Волі адбыўся фініш усебеларускага зорнага вэлёпрабегу. У фінішы прымала ўдзел 50 фізкультурнікаў ад усіх округ БССР.

Першай прыйшла каманда Менску, за ёю аршанскія фізкультурнікі. На Пляцы Волі ўдзельнікаў прабегу сустракала дэманстрацыя фізкультурнікаў Менску і дэлегацыя кітайскіх студэнтаў. Пасьля прывітаньняў дэманстранты і ўдзельнікі прабегу накіраваліся да Дому Культуры вітаць XIII зьезд КП(б)Б.

Вечарам у клюбе друкароў адбыўся вялікі вечар, прысьвечаны фінішу. З прамовай выступіў старшыня ВСФКБ тав. РЫЖОЎ, які адзначыў ролю фізкультуры ў справе выкананьня прамфінпляну.

Удзельнік Менскай каманды т. САКОВІЧ паведаміў аб тэй рабоце, якую прарабілі на вёсцы ўдзельнікі вэлёпрабегу.

НОВЫЯ РАБОЧЫЯ СТАЛОЎКІ

— МЦРК адкрыў рабочую сталоўку на **Старажоўцы** на 800 чалавек. Сталоўка аб служыць рабочых бровару «Беларусь» і аддзяленьне хлебазаводу.

— 20-га чэрвеня адкрываецца сталоўка на 1.500 чалавек на **пабудове Усебеларускай выстаўкі.**

— Адкрыты сад-сталоўка ля **гуты «Прапетары»** на 1.000 чалавек.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ МЭТАДАЛЁГІЧНАЯ НАРАДА

Учора ў Менску, у доме Працасьветы, адкрылася Усебеларуская мэтадалёгічная нарада, на якую са ўсіх округ БССР зьехалася каля 100 дэлегатаў. На нарадзе заслуханы даклады т. **Платуна**—аб становішчы народнай асьветы ў БССР і тав. **Жыгмунда** аб рэарганізацыі вясковых школ.

ДЭЛЕГАЦЫЯ КІТАЙСКІХ СТУДЭНТАЎ У МЕНСКУ

1-га чэрвеня дэлегацыя студэнтаў міжнародных ленінскіх курсаў знаёмілася з вырашэньнем нацыянальнага пытаньня ў БССР, наведала унівэрсытэцкі гарадок і Камвуз.

Вечарам дэлегацыя вітала XIII зьезд КП(б)Б.

Учора кітайскія студэнты наведалі балотную станцыю. Вечарам, у актавай залі БДУ, адбыўся вечар змычкі кітайскіх і беларускіх студэнтаў.

Сёньня дэлегацыя выяжджае ў раёны Меншчыны для азнаямленьня з ходам калектывізацыі.

НАВІНЫ МЦРК.

З сёняшняга дня МЦРК пачынае выдаваць найшчыкам **КРУПЫ**—для 1-й катэгорыі 1½ кілё на сдака, для 2-й і 3-й—па адным кілё; **СЕЛЯДЦЫ**—1-й катэгорыі—1 кілё, 2-й і 3-й—па 500 гр., **МУКУ БУЛЬБЯНУЮ**—1-й катэгорыі—1 кілё, 2-й і 3-й—500 гр., **МЫЛА ГАСПАДАРЧАЕ** па 1 і па палове кавалку.

Грузчыкі атрымліваюць па 2½ кілё мукі і па 2 кілё селядцоў.

БУРАЧНА-ЦУКРОВЫ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ КАМБІНАТ

У Дзяржпляне БССР унесен праект арганізацыі ў Хойніцкім раёне, Гомельскай акругі, бурачна-цукровага агра-індустрыяльнага камбінату.

СТУДЭНТАЎ—НА ПЭДАГАГІЧНУЮ РАБОТУ

Калегія Наркамасьветы пастанавіла вылучыць са складу палітэхнікумаў найбольш здольных студэнтаў на пэдагагічную работу ў ніжэйшых, сярэдніх і індывідуальных навучальных установах на малодшых курсах. У Менскім палітэхнікуме будзе вылучана на пэдагагічную работу 5 студэнтаў і Віцебскім палітэхнікуме—6.

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ПАЯВЫХ УЗНОСАЎ ДЛЯ ПАЙШЧЫКАЎ

Выходзячы з апошніх дырэктыў і пастановы Белкаапсаюзу, праўленьне МЦРК пастанавіла павялічыць паявы ўзнос для пайшчыкаў наступным чынам. Пайшчыкам, якія плацяць 15 руб. паявога ўзносу, пай павялічваецца на 2 р. 50 к., 20-рублёвы пай павялічваецца на 4 р. 50 к., 30-рублёвы—на 7 руб. і 40-50 руб.—на 10 руб. Для ўзносу дадатковага паю робіцца растэрміноўка ад 1 чэрвеня да 1 кастрычніка.

Льготным пайшчыкам і ўтрыманцам пай не павялічваецца.

ЗА ДЗЕНЬ

— У Менску адкрыліся **акруговыя курсы па павышэньні кваліфікацыі настаўнікаў сямігодак.** На курсы прынята 100 чалавек.

— Мен. інспэкцыя асьветы паслала **на работу ў школах калгасаў і саўгасаў** 110 настаўнікаў, скончыўшых Белпэдтэхнікум і двухгадовыя настаўніцкія курсы.

— У Менску адкрыта зараз 49 дзіцячых садоў і ачагоў. Акрамя таго, пры жактах і прадпрыемствах адкрыта 60 дзіцячых пляцовак. Пры калгасах і саўгасах Меншчыны адкрыта 250 дзіцячых пляцовак.

„Белрыба" правяліла загатоўку ракаў

Загатоўкай і экспартам ракаў займаўся заўсёды Белдзяржгандаль. Пастанова, крок за крокам, Белдзяржгандаль разьвіў гэту справу ў БССР і з вялікімі труднасьцямі паладзіў экспарт ракаў у Нямеччыну. Але... нарадзілася новае таварыства — «Белрыба», якому таксама захацелася прыкласьці свае рукі да загатоўкі і экспарту ракаў.

— Праваліце гэту справу — заявілі ў Наркамгандалі кіраўніком «Белрыбы», вазьмецеся пакуль што за рыбу, за разьвіцьцё рыбнай гаспадаркі ў БССР.

— Глупства — адказалі «белрыбаўцы», справімся...

Перш за ўсё «Белрыба» наняла штат упоўнаважаных па раках і раскідала іх па ўсіх округах БССР, забясьпечыла іх папяровымі інструкцыямі і загадала: «Загатоўляйце ракаў».

Але ракі, нешта не загатаўляліся. Справа ня клеілася.

Наступіў май месяц, а «воз і зараз там»...

І раптам з Воршы акрэнгандаль тэлеграфуе Наркамгандалю. «Белрыба» праваліла загатоўку ракаў, апарат бязьдзейнічае, санкцыянуйце загатоўку ракаў Белдзяржгандалем».

Устрывожыўся Наркамгандаль і санкцыянаваў загатоўку ракаў Белдзяржгандалем. Не прайшло і двух дзён, як аналёгічныя тэлеграмы сталі паступаць і з Полацку, Віцебску.

Між тым «Белрыба» адмаўляецца перадаць справу загатовак ракаў. Патрэбны самыя рашучыя і тэрміновыя меры да ўрэгуляваньня гэтага пытаньня.

С. П.

Хто вінаваты ў псаваньні рыбы

Рад фактаў сьведчаць аб нядбайных, няўважлівых адносінах апарату «Белрыбы» і чыгуначнай адміністрацыі да ўпакоўкі і перавозкі рыбы.

6 скрынак рыбы, якія прыбылі ў Менск са станцыі Крупкі (3 гадзіны язды) зусім папсаваліся.

Загадчык Лукомльскай рыбнай гаспадаркі, які паслаў рыбу гужом да ст. Крупкі, не зацікавіўся тым, як адпраўлена рыба. Тавар прыбыў на станцыю бяз лёду. Начальнік станцыі Крупкі трымаў скрынкі з рыбай на станцыі на працягу сутак, бо... таварная станцыя пасьля 4 гадз. закрыта; нельга выпісаць дакуманты. Толькі пасьля прысуду прадстаўніка «Белрыбы» ён згадзіўся выпісаць дакуманты.

Такія-ж адносіны да рыбных прадуктаў маюць на ст. Менск, дзе таксама ня ўлічваюць, што рыба хутка псуецца. 27-га мая, напрыклад, рыба, якая павінна была быць выгружана а 7 гадз. раніцы, была выгружана толькі а 12 гадз. дня.

Нават пасьля таго, як рыба трапляе на фурманку, няма ўпэўненасьці ў тым, што яна адразу-ж пойдзе ў продаж, бо бывае, што загадчык крамы або сталоўкі не падрыхтаваны да прыёму рыбы.

Толькі зараз пасьля выпадку з сапсаваньнем 6 скрынак рыбы, апарат «Белрыбы» парашыў скласьці падрабязную інструкцыю аб правілах упакоўкі і адпраўкі рыбы.

Неабходна прыцягнуць да адказнасьці ўсіх тых, хто нядбайна адносіцца да хаваньня і перавозкі каштоўнай і вельмі патрэбнай прадукцыі.

Рыбак.

МЦРК дрэнна абслугоўвае сэзоньнікаў

Пры Фрунзаўскім РК КП(б)Б адбылася нарада членаў ЦП саюзу будаўнікоў, рабочкомаў і розных будаўнічых арганізацый. На нарадзе быў заслуханы даклад МЦРК аб забесьпячэньні сэзоньнікаў прадуктамі.

З дакладу і спрэчак выявілася, што МЦРК дрэнна абслугоўвае сэзоньнікаў. Сетка сталовак і ларкоў непыстарчальная. На пабудове дому ўраду, дзе працуе каля тысячы рабочых, няма ні адной сталоўкі. Сталоўка унівэрсытэцкага гарадка перагружана, у ёй абедаюць, апрача рабочых унівэрсытэцкага гарадка, яшчэ і рабочыя дому ўраду, пабудовы фабрыкі-кухні і інш.

Большая частка сэзоньнікаў прымушана харчавацца сухою стравою. У ларкох амаль нічога няма, не заўсёды ёсьць нават селядцы, прадукты часта бываюць нядобраякасныя.

МЦРК ня сочыць за выкананьнем сваіх дырэктыў на мясцох. Будаўнічыя арганізацыі таксама слаба цікавяцца пастаноўкаю забесьпячэньня сэзоньнікаў харчамі.

Нарада адзначыла, што МЦРК аднеслася да справы забесьпячэньня сэзоньнікаў нядбайна. Пастаноўлена прасіць АКК РСІ сумесна з МЦРК праверыць работу сеткі сталовак і ларкоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі пабудоў. МЦРК запрапанавана ў 5-цідзённы тэрмін заслухаць на праўленьні вынікі гэтай праверкі.

Курсы па падрыхтоўцы ў камвуз Беларусі

Паводле пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 11 мая 1930 г., у мэтах паляпшэньня складу і падрыхтоўкі набору Камвузу, арганізуюцца спэцыяльныя курсы па падрыхтоўцы ў камвуз на наступных умовах:

1. Курсы праводзяцца за лік часу, які даецца для падрыхтоўкі ўсім паступаючым у камвуз (2 месяцы, згодна пастановы Наркампрацы ад 5 лютага 1929 г. № 9 і пастановы ЦК ад 11 мая 1930 г.) з захаваньнем заработнае платы на месцы работы і захаваньнем пасады да канчатковага залічэньня на вучобу ў камвуз.

2. На курсы прымаюцца: рабочыя і работніцы ад варштату і батракі, якія ня маюць неабходнай падрыхтоўкі для паступленьня ў камвуз з ліку тых таварышоў, якія ўжо прайшлі ці пройдуць мандатную камісію КУБ да 15 чэрвеня 1930 г.

3. Усе кандыдатуры на курсы падрыхтоўкі ў Камвуз, якія яшчэ не прайшлі мандатнай камісіі КУБ, абгаворваюцца на парт'ячэйках і тэрмінова накіроўваюцца ў камвуз праз адборачныя камісіі акруткомаў.

4. Курсы пачынаюць працаваць з 20 чэрвеня і працягнуцца да 20 жніўня. Усе таварышы, якія з посьпехам прапрацуюць праграму курсаў, будуць бяз іспытаў залічаны ў Камвуз.

5. У часе прабываньня на курсах слухачы забясьпечваюцца інтэрнатам, харчаваньнем, падручнікамі і навучальнымі прыладамі і праездам на чыгунцы за кошт Камвузу. На курсы будзе прынята 130 чал.

Дапамога сем'ям калгасьнікаў-пераменьнікаў

Праўленьне Белкалгасцэнтру запрапанавала ўсім акруговым і раённым калгасаюзам безадкладна дапамагчы сем'ям калгасьнікаў-пераменьнікаў, якія прызываюцца для прахаджэньня лягерных збораў.

У тым выпадку, калі ў сям'і пераменьніка, пасьля яго адыходу, зусім не застаецца працаздольных членаў, за імі захоўваецца сярэдні разьмер заработнай платы. Калі ў сям'і пераменьніка застаецца адзін працаздольны, пры наяўнасьці ня менш двух непрацаздольных, праўленьні калгасаў выдаюць дапамогу ў разьмеры 50 проц. зарплаты пераменьніка.

Праўленьні калгасаў павінны даваць работу працаздольным членам сям'і пераменьнікаў, перавожна перад іншымі калгасьнікамі.

АРХЭАЛЁГІЧНЫЯ РАСКОПКІ НА МАГІЛЕЎШЧЫНЕ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Улетку на тэрыторыі Магілеўшчыны будуць працаваць тры навуковыя экспэдыцыі БАН—глебазнаўчая, этнаграфічная і гістарычна-мастацкая. У часе археалёгічных раскопак у Вэйна знойдзен касьцяк першабытнага чалавека, які ляжаў на глыбіні каля двух мэтраў, каля касьцяка знойдзен крэмнёвы нож і шліфаваны малаток.

З лістоў рабселькораў

АБ СІЛАСАВАНЬНІ НЯ ВЕДАЮЦЬ

У **Сьмілавіцкім** раёне (Меншчына) нічога ня робіцца ў напрамку сіласаваньня. Пляны ня складзены. Тэрмін сяўбы расьліў скончыўся, а закладкі сіласаваньня ня зроблена.

Партыйныя ячэйкі таксама ня прымаюць ніякіх мер, каб арганізаваць справу сіласаваньня.

Каліна.

НЯМА АРГАНІЗАЦЫІ РАБОТЫ

Арганізацыя работы ў калгасах **Самахвалавіцкага** раёну (Меншчына) пастаўлена дрэнна. Калгассаюз ня прымае ніякіх мер і не дае паказаньняў у пытаньні арганізацыі работы ў калгасах. Месячнік па арганізацыі работы ў калгасах, які праводзіцца, не знайшоў належнага адбітку. Наглядаюцца масавыя прагулы, асабліва шмат прагулаў прыпадае на калгас **«Чырвоны Партызан»** Кайкаўскага сельсавету. У выніку сяўба ў паказаным калгасе пад нагрозай зрыву.

Раённым арганізацыям неабходна запяцца пытаньнем арганізацыі работы ў калгасах.

Б.

СЕНАЖАЦЬ КАЛГАСАМ НЕ АДВЕДЗЕНА

Праз нейкі час надыдзе касьба, а пра адвод сенажаці для калгасаў **Бягомльскага** раёну ніхто ня думае. У раёне ёсьць пяць каморнікаў, але яны за гэту работу ня браліся, хаця і маюць шмат вольнага часу.

У Бягомльскім раёне налічваецца 29 калгасаў, каля 2 тыс. кароў і 500 коняй, якія, калі ня будзе адведзена сенажаць, застануцца бяз корму.

Райвыканкому і сельсаветам трэба неадкладна паклапаціцца аб адводзе сенажаці калгасам.

Б—а.

МАРЫНУЮЦЬ 20 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

Рымарная майстэрня таварыства «Прыхільнік дзяцей» **(Ворша)** мае гатовай прадукцыі (хамуты, падсядзёлкі) на 20 тыс. рублёў. Паказаная прадукцыя ляжыць на складзе, а Скурсындыкат не дае нараду для адпраўкі ў калгасы і іншыя арганізацыі.

Два разы паведамлялі Скурсындыкату, каб апошні даў нарад на адпраўку гатовай прадукцыі, але і на сёняшні дзень нараду майстэрня не атрымала.

П.

АБ ВОЛЬНАНАНЯТЫХ ЗАБЫЛІСЯ

Пры Аб'яднанай Беларускай вайсковай школе ёсьць вольнананятыя рабочыя, якія абслугоўваюць школу. Сярод вольнананятых ніякай палітычнай работы не вядзецца. Палітраўнік, якому даручана праводзіць заняткі, нічога ня робіць. Таксама ня цікавіцца саюз камунальнікаў, у якіх умовах прыходзіцца працаваць вольнананятым. Асабліва ў дрэнных умовах знаходзяцца рабочыя і работніцы, якія працуюць на кухні.

Саюз камунальнікаў і камандаваньне школы павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на правядзеньне культурна-асьветнай работы сярод вольнананятых.

Курсант.

ГРОШЫ ТРАЦЯЦЬ, А ТОЛКУ МАЛА

Пры **Шацкім** спажывецкім таварыстве ёсьць адкормачны пункт, дзе знаходзіцца 24 шт. сьвіней. Праўленьне таварыства ня прымае ніякіх мер для зьнішчэньня недахопаў, якія маюць месца на адкормачным пункце. Так, сьвіньні знаходзяцца ў гразі, ім не надсьцілаецца і зусім дрэнна адносяцца рабочыя да догляду за сьвіньнямі. Больш году сьвіньні стаяць на адкормачным пункце і ніяк не направіліся.

Шмель.

З-ЗА ГАЛАВАЦЯПСТВА — НЯШЧАСНЫЯ ВЫПАДКІ

Некаторыя адміністратары фабрыкі «Беларуска» (Менск) ня прымаюць належных мер, каб папярэдзіць няшчасныя выпадкі. Рабочыя, якія прымаюцца на работу, ня ўводзяцца ў курс справы і, не пазнаёміўшыся з машынамі, ставяцца на работу. У выніку маюць месца няшчасныя выпадкі.

31 мая на фабрыцы адарыўся няшчасны выпадак з работніцай Каплан і адным рабочым толькі з-за галавацяпства кіраўнікоў цэху і майстра **Нікіценкі.** Работніцу Каплан, якая зусім нядаўна працуе на фабрыцы і не знаёма з машынамі, паставілі працаваць пры машыне, апошняя была не ўрэгулявана і не пастаўлена да яе ахоўваючая скрынка. У выніку работніца пакалечыла сабе руку. Рабочы быў пастаўлен пры цыркулярцы ў той час, калі ён ніколі не працаваў. Ён таксама пакалечыў сабе руку.

Такому галавацяпству трэба накласьці канец.

К.

ПАДКУЛАЧНІКІ АГІТУЮЦЬ

На сходзе калгасьнікаў **вёскі Ліпкі,** Смалявіцкага раёну супроць калгасу выступалі асобныя беднякі, падкуплёныя кулакамі. Калі чыталі дакрэт аб льготах і крэдытах, дык бяднячка **Галавачанка** Зося гаварыла: «Нам крэдыты не патрэбны, кулакі нам даводзяць без звароту грошай і калі толькі нам патрэбна». **Граковіч Н. і Пратаповіч** гаварылі: «На што было кулакоў высяляць, кулакі ў нас процантаў ня бралі за грошы, а дзяржаве трэба процанты плаціць». Падкулачнікі распаўсюджваюць новую правакацыю, што сёраднякоў трымаюць у калгасе да восені, а ўвосень іх высяляць, а ў калгас возьмуць толькі беднякоў.

Неабходна павесьці растлумачальную работу, даўшы рашучы адпор падкулачнікам.

Я. Гафт.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ЦКК КП(б)Б

ЦК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што на пасяджэньні 13-га чэрвеня, а 6½ гадз. веч., будуць разглядацца наступныя справы: **Асмалоўскага,** Васіля Янкава; **Нястрахава,** Міколы Аляксеева; **Шлома,** Рыгора Гаўрылава; **Варзэвацкага,** Яэзна Антосева; **Меярзона,** Навума Сымонава; **Волкінштэйна,** Навума Львовіча; **Далбанюка,** Янкі Міколава; **Сямашкі,** Сьцяпана Пятровіча; **Скарахода,** Данілы Лявонава; **Душчыца,** Абрама Лейзарава; **Агалава,** Міколы Цімохава; **Зайцава,** Уладзімера Сьцяпанава; **Юрзвіча,** Войцэха Язэпава; **Самойлава,** Віктара Міколава; **Бацянова,** Міхаіла Макарава; **Гарбацэвіча,** Яўхіма Пятрова і **Маставога,** Якуба Ціханава.

Памянёныя таварышы запрашаюцца для ўдзелу пры разглядзе іх справ. Праезд за свой кошт. Таксама запрашаюцца старшыні праверкамісій, дзе гэтыя таварышы праходзілі чыстку, і сакратары яч., дзе яны лічацца на вучоце і калі яны знаходзяцца ў Менску.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б

ЛЯЎКОЎ.

СЁНЬНЯ

Жакт № 17 (Гандлёвая, 50-1). Агульны сход камуністых, якія пражываюць у домах Жакту. Пач. а 19 гадз.

Дом Асьветы. ЦП саюзу Працасьветы закупіла для членаў саюзу на 3 чэрв. оперу «АІДА», а на 5-га—**«Чалавек з партфэлем».** Білеты ў канц. дому ад 12-2 і ад 6-10 гадз. веч.

Нарада членаў Кастрычніцкага РК МОПРУ—а 19 гадз. у памяшканьні РК КП(б)Б. Ляўка абавязкова.

Сад Працасьветы. Кіно—«Паэт і цар» і камэдыя—«Находчывы паклоньнік» з удзелам Моиці Белкса. Каса ад 4-х гадз. Пачатак а 9 гадз.

БДУ. У 41 аўд. (стары будынак Пэдфаку) адбудзецца працяг агульн. адчыненага партсходу яч. КП(б)Б саўбуду і права па абгаварэньні тэзісаў тав. **Якаўлева** да XVI-га партзьезду. Ляўка партыйцаў і камсамольцаў абавязкова. Запраш. беспартыйныя студэнты і навуковыя працаўнікі. Пачатак а 8 гадз. 20 хв. веч.

Да ведама студэнтаў БДУ. Студэнты і настаўнікі, якія ўзялі кнігі з бібліятэкі вайсковага габінэту БДУ, павінны вярнуць іх не пазьней 6 чэрв. з прычыны перавучоту і перадачы бібліятэкі новаму бібліятэкару.

Выканбюро СВБ паведамляе, што цэнтральны антырэлігійны курсы ўлетку г. г. не адбудуцца.

ЗАЎТРА

Кастрычн. РК КП(б)Б. А 18 гадз. нарада выторчых ячэек МОПР'у. Прысутнасьць старшынь і сакратароў яч. абавязкова. Запраш. МОПР актыў.

Нарада будаўнічых яч. МОПР'у 5-га чэрв., а 19 гадз., у памяшканьні Кастр. райкому партыі (вул. Урыцкага). Ляўка старшынь і сакратароў яч. абавязкова. Запраш. МОПР. актыў.

Пэдгабінэт. Расклад падгаўляючых канфэрэнцый настаўнікаў **гар.** школ: 3-га чэрв.—«О» груп., 4-га чэрв.—«І» груп., 5-га—«П» і 6-га чэрв.—мовы і літаратуры. Пачатак а 10 гадз. раніцы.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Кастрыч. РК КП(б)Б. У памяшк. клюбу Леніна (вул. Урыцкага) адбудзецца нарада сакратароў яч. КП(б)Б, кіраўнікоў сэктараў партасьветы і масавых кампаній і прапагандыстых в наступным парадкам дня: аб ходзе прапрацоўкі тэзісаў да XVI-га партзьезду. Усе КП(б) і аб рэарганізацыі крамнай сеткі МЦРК. Пачатак а 6 гадз. веч.

Расп. бюро АРУ. У памяшк. АРУ (Савецкая, 65) адбудзецца чарговае пасяджэньне прэзыдыуму Расп. бюро АРУ. Запрашаецца актыў АРУ. Пачатак а 7 гадз. веч.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Аўторак, 3 чэрвеня для саюзу працасьветы „АИДА" опэра ў 4 дз. муз. Вэрдзі.
Пачатак а 8 г. 30 м. увеч.

КІНО ЭКСПРАМЦЫЯНА | Мастацкая кіно-аповесьць ВЕЦЕР у ТВАР
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.
Звыш праграмы кіно-штомесячнік Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая" № 6, прысьвечаны XIII зьезду КП(б)Б.
У нумары: 1. Менская акруговая партканфэрэнцыя. 2. Адчыненьне XIII зьезду КП(б)Б. 3. Асінбуд. 4. Зорныя вэлёсыпэдныя прабегі. 5. Унівэрс. гарадок. 6. 25-гадовы юбілей літарат. дзейнасьці Янкі Купалы. 7. Масавая экскурсія на Дняпрабуд.

КІНО САД (Савецкая. 71) | Нямецкі фільм Паводле навэлі СТЭФАНА ЦВЭЙГА. СТРАХ
драма ў 8 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га 10 г. 30 м. Каса з 6 гадз.

КІНО Пралетары | 2-й ТЫДЗЕНЬ ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН МІС МЭНД
2 сэрыі—11 частак у адзін сэанс
У галоўнай ролі Ігар Ільінскі
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" | Мастацкі фільм у 2-х сэрыях—12 частках. „КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА"
Аб'едзьве сэрыі ў адзін сэанс.
Пачатак 1 сэансу а 2-х гадз. Каса з 12 г.

КІНО СПАРТАК | НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ ВІНАВАТЫ (СУДОВАЯ ПАМЫЛКА)
У галоўнай ролі Бэрнгард Гэтцке.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
КАСА—АД 5 Г. 30 М.

Тэатр саду „Прафінтэрн" | Мастацкі перасовачны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
Аўторак, 3 чэрвеня, для саюзу друкароў
ЧУДАК намэдыя ў 4-х дзеях.

Вышаў з друку, паступіў у продаж і рассылаецца падпісчыкам
№ 4 „МАЛАДНЯК"